КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 46 (367) ◂ 6 снежня ◂ 2013 г.
www.novychas.info

# Новы Час



ЯДВІГА ЛЯСЬЕЎСКАЯ

Стар. 14–15

**НАШЫ ПРАВЫ — НАША БАГАЦЦЕ**

10 снежня ўвесь цывілізаваны свет адзначае Дзень правоў чалавека. Ён святкуецца па прапанове Генеральнай Асамблеі ААН штогод, пачынаючы з 1950 года

Стар. 5

**МЫ — КЛАНДАЙК АРХАІКІ**

Показкі пра тое, што беларусы — людзі хутару і балота, таму і ментальнасць наша своеасаблівая, — не пустыя словы. Прастора фармуе чалавека, а чалавек прастору

Стар. 6

**КАНЕЦ КІТАЙСКАГА ГУЛАГУ?**

Стар. 12

ISSN 2218-2144

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**ДА НОВАГА ГОДА ВЫ ЯШЧЭ МОЖАЦЕ ПАДПІСАЦЦА НА «НОВЫ ЧАС» ПА СТАРЫХ КОШТАХ!**

▸ З НАГОДЫ

# МЫ — НЕ БЕЛАРУСЬ! БОЛЬШ НАС БІЦЬ НЕ БУДУЦЬ!

Аксана КОЛБ

**Апошнія дні ўся дэмакратычная грамадскасць Беларусі ўважліва назірае за падзеямі ва Украіне. Шмат хто бачыць у гэтым добры знак для нашай краіны. Але што агульнага ў пратэстных Беларусі і Украіне?**



Еўрамайдан–2013. Кіеў

«Я вельмі моцна ўсцешаны навінам з Украіны і перакананы, што гэта вельмі пазітыўны знак для дэмакратычнай Беларусі»,— заявіў «Свабодзе» Анатоль Лябедзька. Мне таксама хацелася б на гэта спадзявацца, але... Хутчэй Украіна мае шанец прайсці шляхам Беларусі, чым наадварот. Ва ўсялякім разе, пакуль што. Зараз, як ніколі, я хацела б памыліцца, таму прапаную паспрабаваць ва ўсім разабрацца, хаця б штрыхамі.

## Улада

10 ліпеня 1994 года Леанід Кучма быў абраны прэзідэнтам Украіны, змяніўшы на гэтай пасадзе Леаніда Краўчука, які не стаў чапляцца за ўладу, выкарыстоўваць адміністратыўны рэсурс і з гонарам прайграў на свабодных і дэмакратычных выбарах. Леанід Краўчук па сённяшні дзень застаецца адзіным першым прэзідэнтам краін СНД, які сышоў добраахвотна, мірна і годна.

Пасля Кучмы, які ўжо не вельмі хацеў аддаваць уладу, быў Віктар Ючшанка. Яго прэзідэнцтва падштурхнуў Майдан і рашучыя дзеянні Юліі Цімашэнка. Але выбары зноў былі свабодныя і дэмакратычныя. Чарговым, ужо чацвёртым прэзідэнтам, за 19 гадоў стаў Віктар Януковіч.

Не будзем паглыбляцца ў магію імёнаў (Леанід, Леанід, Віктар, Віктар) і гадаць, хто стане наступным прэзідэнтам. Але адзначым — ва Украіне яшчэ не было перыяду ўмацавання аўтарытарнай улады. Ён толькі пачынаўся, ці можа пачацца. Украіна яшчэ не ведае маштабных зачыстак палітычнага, грамадскага і медыйнага поля. Яна яшчэ можа пахваліцца сапраўднымі выбарамі, шматлікім незалежнымі СМІ (у тым ліку тэлеканаламі), яе грамадскі сектар і палітычныя партыі яшчэ не перайшлі на паўлегальнае становішча. Тут існуе сістэмная апазіцыя. Дэпутаты розных узроўняў сапраўды абіраюцца народам. Апазіцыйныя лідары ўзначальваюць мэрыі, фракцыі парламента і нават вобласці.

Магчыма, Украіна толькі адчыняе дзверы ў аўтарытарызм. У Віктара Януковіча папросту яшчэ не было часу выбудаваць і пачаць паўнавартаснае ажыццяўленне схемы ўмацавання сваёй улады. А можа, справа не ў часе, а ў жаданні. Можа, Віктар Януковіч — з тых палітыкаў, хто не стане дабівацца ўлады любым коштам? Паглядзім.

А зараз пра Беларусь. 10 ліпеня 1994 года прэзідэнтам нашай краіны стаў Аляксандр Лукашэнка. У выніку свабодных і дэмакратычных выбараў. Усё! На гэтым супадзенні заканчваюцца. За 19 з лішкам гадоў Беларусь ведала толькі аднаго прэзідэнта, ці, лепей сказаць, кіраўніка Беларусі. І ўсе гэтыя гады Лукашэнка метадычна ўмацоўваў сваю ўладу, ідучы крок за крокам, часам гуляючы ва-банк, як у лістападзе 1996 года.

Дарэчы, менавіта 1996 год стаў паваротным у найноўшай гісторыі Беларусі. Памятаеце 26 красавіка 1996-га? Мужчыну з акрываўленай галавой, украінцаў, што пераварочвалі міліцэйскі аўтобус? Памятаеце восень 1996-га і шматдзённае стаянне на плошчы Незалежнасці? Магчымы імпічмент, гвалтоўнае змяненне старшыні ЦВК і цалкам сфальсіфікаваны рэферэндум?

Чамусьці зараз ніхто не ўзгадвае, што той рэферэндум быў сфальсіфікаваны. Усю ноч з 26 на 27 лістапада работнікі выканкамаў розных узроўняў перапісвалі бюлетэні, каб потым ЦВК вуснамі Ярмошынай мог паведаміць патрэбныя вынікі (гэта пазней сістэма фальсіфікацыі будзе наладжана такім чынам, каб не ўскладняць жыццё сябрам выбарчых камісій і старшыням выканкамаў).

**Працяг на стар. 4**
**(працяг тэмы на стар. 2, 11)** ▸

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГОМЕЛЬ. СУДЫ ЗА ДЗЯДЫ

**Сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Уладзімір Шыцікаў атрымаў позву ў суд Навабеліцкага раёна Гомеля для разгляду адміністрацыйнай справы, паводле якой начальнік аддзелу грамадскага парадку Навабеліцкага РАУС Гомеля, падпалкоўнік Генадзь Хількевіч абвінавачвае актывіста ў парушэнні парадку арганізацыі і правядзення масавага мерапрыемства.**

Судовае разбіральніцтва ў судзе Навабеліцкага раёну Гомеля прызначана на 10 снежня.

— Выклік у суд звязаны з маім удзелам у акцы памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій, якая прайшла ў Гомелі 3 лістапада. Я разам з іншымі актывістамі ўсклаў кветкі і вянкі, запаліў зьнічы каля пакутных крыжоў, якія ўсталяваны на месцах масавых забойстваў людзей у гады сталінскіх рэпрэсій, — заявіў У. Шыцікаў.

Нагадаем, 13 лістапада суддзя Сяргей Новікаў (Навабеліцкі суд Гомеля) пакараў намесніка старшыні АГП Васіля Палякова штрафам у памеры 4,5 мільёна рублёў (35 базавых велічынь) за удзел у акцы памяці ахвяр сталінскіх рэпрэсій. Актывіст абскарджвае штраф у Гомельскім абласным судзе.

Вясной Васіля Палякова і Уладзіміра Шыцікава гэты ж суд пакараў буйнымі адміністрацыйнымі штрафамі за ўскладанне кветак да месца, дзе жыла гістарычная дзяячка Палуда Бадунова. Прайшоўшы ўсе ўнутраныя сродкі праваой абароны, актывісты не змаглі абараніць правы ўнутры краіны. Зараз іх скаргі перададзеныя на разгляд у Камітэт па правах чалавека ААН.

**«Гомельская вясна»**

### БРЭСТ. АБЛАСНЫ СУД ПАДТРЫМАЎ ЗАБАРОНУ ПІКЕТА Ў БЯРОЗЕ

**Брэсцкі абласны суд не задаволіў касацыйную скаргу праваабаронцаў з Бярозы, якія прасілі прызнаць незаконнай забарону пікета 4 жніўня і адмяніць рашэнне суда Бярозаўскага раёна, які прызнаў рашэнне райвыканкаму правамоцным.**

Па словах праваабаронцы Сержука Русецкага, адмова ў пікеце ў падтрымку палітвязняў парушыла канстытуцыйнае права на свабоднае выказванне сваіх поглядаў і меркаванняў.

Прычынай для адмовы стала адсутнасць дамоваў з міліцыяй і бальніцай. Як раённы суд, так і абласны не звярнулі ўвагі на довады праваабаронцаў аб нелагічнасці заключэння дамоваў. Міліцыя спаслалася на Пастанову Саўміна №207 ад 2012 года, у п. 5 якой сказана, што пасля падачы заявы цягам сутак райвыканкам павінен дасласць копію заявы ў міліцыю для ўзгаднення (чаго райвыканкам не зрабіў). Бальніца ж не заключыла дамову, бо гэта не прадугледжана ў дакументах Міністэрства аховы здароўя, і няма нават прэйскуранта на падобныя паслугі.

Праігнаравалі суддзі таксама і тое, што райвыканкам значна парушыў тэрміны адказу.

Паводле словаў праваабаронцаў, яны будуць змагацца як у нацыянальных судовых інстанцыях за свае правы, так і пры неабходнасці накіруюць скаргу ў Камітэт правах чалавека ААН.

**spring96.org**

### ГОРКІ. ПРАЦЯГВАЕЦЦА ЦІСК НА ДЭПУТАТА АД БХД ШЧАРБІНІНУ

**У Горацкім раёне мясцовыя ўлады працягваюць ціск на дэпутата Аўсянкаўскага сельсавету, актывістку аргкамітэту БХД Жанну Шчарбініну.**

«Пасля звальнення са школы з 2 верасня я афармілася на стаўку прыёмнай маці. 5 верасня прадстаўнікі аддзела адукацыі ў мяне дома правялі праверку маёй прыёмнай сям'і, у выніку якой я атрымала дысцыплінарнае спагнанне — заўвагу. З кастрычніка я была ў Мінску на прэс-канферэнцыі для журналістаў, загадзя дамовіўшыся, што мая прыёмная дачка ў гэты час будзе знаходзілася ў маёй роднай сястры. Да сямі гадзін вечара я ўжо была дома. Ні ў адным дакуменце не прапісана, што прыёмныя бацькі не маюць права пакідаць на некаторы час дзяцей са сваімі блізкімі, але 4 лістапада за гэта я атрымала наступнае дысцыплінарнае спагнанне — вымову», — паведаміла Жанна Шчарбініна.

У выніку ёй давялося звярнуцца ў Горацкі раённы суд з заявай, каб той прызнаў прыцягненні яе да дысцыплінарнай адказнасці неабгрунтаванымі. 19 кастрычніка першае дысцыплінарнае спагнанне суд адмяніў. 10 снежня, у Дзень правоў чалавека, адбудзецца судовае пасяджэнне па вымове. «Спадзяюся, што і на гэты раз правасуддзе будзе кіравацца толькі законам», — адзначыла актывістка БХД.

Жанна Шчарбініна таксама распавяла, што яна як дэпутат сельсавету двойчы звярталася ў Камітэт дзяржкантролю па пытанні карупцыі ў Аўсянкаўскага сярэдняй школе, дзе яна раней працавала.

«Праверкі належным чынам не праводзіліся, таму я звярнулася ў Генеральную пракуратуру і Адміністрацыю прэзідэнта. Цяпер гэта пытанне разглядаецца Пракуратурай Горацкага раёна. Можа, нарэшце каго-небудзь зацікавяць махінацыі ў гэтай школе, напрыклад, як адны і тыя ж навучэнцы могуць адначасова вучыцца ў дзвюх школах? (Дакладней, у адной на пачатку навучальнага года лічацца, але не вучыцца, а потым зноў бацькам бы вярнуцца ў сваю школу, і так на працягу некалькіх гадоў)», — адзначыла дэпутат.

**Прэсавая служба БХД**

---

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## САЛІДАРНЫЯ З УКРАІНАЙ

Сяргей ПУЛЬША

**Пакуль афіцыйны Мінск не выказваўся наконт падзеяў ва Украіне. Аднак палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі выказаліся ў падтрымку Еўрамайдана. Кожны — у розны ступені.**

Лідар Партыі БНФ Аляксей Янукевіч заявіў, што ўважліва сочыць за падзеямі ў Кіеве. «Украіна — надзвычай блізкая для нас краіна, краіна-суседка, і таму для нас мае вялікае значэнне той праеўрапейскі ўздым, які цяпер ускалыхнуў украінскае грамадства. Сёння ў Кіеве вырашаецца не толькі лёс самой Украіны, але і лёс усёй Усходняй Еўропы. Партыя БНФ шчыра жадае поспеху ўсім прыхільнікам еўрапейскага шляху для Украіны, выказвае салідарнасць і падтрымку ў іх справе», — кажацца ў заяве лідара БНФ.

Палітрада Аб'яднанай грамадзянскай партыі таксама прыняла адмысловую заяву па падзеях у Кіеве. АГП выказвае «салідарнасць з прыхільнікамі еўраінтэграцыі, якія выйшлі на вуліцу, каб яшчэ раз засведчыць сваю прыхільнасць еўрапейскім каштоўнасцям і стандартам». «Мы разам з тымі, для каго еўрапейскі выбар — гэта мэта і будучыня. Сёння ў Кіеве вырашаецца не толькі лёс украінцаў, але і ўсіх прыхільнікаў перамен на постсавецкай прасторы», — гаворыцца ў дакуменце.

АГП салідарызуецца з украінцамі не толькі на словах, але і на справе: сябры партыі падаюць заяўкі на шэсці, мітынгі і пікеты ў падтрымку Еўрамайдана. Такія заявы ўжо пададзеныя ў Гомелі, Брэсце, Бабруйску і Магілёве.

Беларускія хрысціянскія дэмакраты таксама вітаюць народ Украіны ў яго імкненні да свабоды і еўрапейскай будучыні. «Мы выказваем салідарнасць з мільёнамі ўкраінцаў, якія змагаюцца за будучыню сваёй краіны, супраць навалы дыктатуры і расійскай акупацыйнай палітыкі. Мы перакана볂, што ўсе спробы задушыць народныя пратэсты, прагу народу Украіны да свабоды, незалежнасці і дэмакратыі будуць марнымі. І Украіна, як у будучым і Беларусь, стануць вольнымі і дэмакратычнымі еўрапейскімі краінамі», — гаворыцца ў заяве БХД.

Адной заявай АГП і БХД не абмежаваліся і падпісалі другую: заяву беларускіх палітычных і грамадскіх дзеячаў, у якой заклікалі ўкраінскія ўлады не выкарыстоўваць сілу супраць пратэстоўцаў і не ўводзіць надзвычайнае становішча ў краіне. У дакуменце гаворыцца аб недапушчальнасці выкарыстання сілы супраць грамадзян, якія выйшлі на вуліцы Кіева, «каб вырашыць лёс сваёй краіны шляхам мірных дэманстрацый і акцый».

Зварот падпісалі Таццяна Новікава (ГА «Экадом», «Зялёная сетка»), Віталь Рымашэўскі (БХД), Анатоль Лябедзька (АГП), Уладзімір Мацкевіч («ЕўраБеларусь»), Леанід Акаловіч (Беларуская аўтакефальная царква), Мікалай Дземідзенка («Малады фронт»), Жанна Літвіна (БАЖ) і іншыя — усяго каля 40 чалавек.

А аргкамітэт па стварэнні Руху салідарнасці «Разам» 3 снежня перадаў ва ўкраінскую амбасаду ў Мінску «рашучы пратэст у сувязі з брутальнымі і незаконнымі дзеяннямі ўкраінскіх уладаў па разгоне мірнага Майдана за еўраінтэграцыю ў Кіеве, у выніку якога пацярпелі сотні людзей».

«Мы патрабуем неадкладнага вызвалення ўсіх затрыманых і пакарання вінаватых, таму што збіццё мірных людзей — гэта злачынства. Мы салідарныя з пацярпелымі падчас разгону мірнай акцыі і іх сем'ямі», — гаворыцца ў петыцыі.

---

МЯСЦОВЫЯ ВЫБАРЫ

## «НАРОДНАЯ ПРАГРАМА»

**Стартаваў чарговы, прымеркаваны да мясцовых выбараў 23 сакавіка 2014 года, этап «Народнай праграмы» — ініцыятывы па выпрацоўцы «дарожных мапаў» рэформаў у розных галінах, якія складаюцца з дапамогай экспертнага і грамадскага абмеркавання.**

У выніку сацыялагічнага апытання на замову Руху «За Свабоду» былі вызначаны восем праблемных тэмаў, якія хвалююць грамадзян Беларусі — патэнцыйных выбаршчыкаў. Гэта паводле працоўных назваў — «Працэдура і ўмовы прыватызацыі гарадаўтваральных прадпрыемстваў»; «Якім чынам павінны прымацца рашэнні аб будаўніцтве шкодных вытворчасцяў?»; «Захады па павышэнні якасці паслуг у галіне ЖКГ»; «Ці варта абіраць кіраўнікоў выканаўчай улады адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак Беларусі ўсеагульным галасаваннем жыхароў гэтай адзінкі?»; «Рэформа сістэмы сярэдняй адукацыі»; «Неабходныя меры па развіцці прыватнага прадпрымальніцтва»; «Якія меры неабходныя для хутчэйшага вырашэння жыллёвай праблемы ў Беларусі?»; «Прыватная ўласнасць на зямлю».

Эксперты па кожнай з гэтай тэмаў рыхтуюць свой аналіз сітуацыі ў адпаведнай галіне і прапановы па рэфармаванні. Дзве тэмы — «Выбарнасць мэраў» і «Прыватная ўласнасць на зямлю» — ужо выкладзеныя на сайт ініцыятывы prahrama.by для абмеркавання ўсіх зацікаўленых асобаў. Адбыліся і два круглыя сталы з удзелам іншых экспертаў, прысвечаныя рэформе мясцовага самакіравання і зямельнай рэформе. Апрача інтэрнэт-абмеркаванняў і экспертных круглых сталоў, будуць выдадзены тэматычныя бюлетэні, якія разашлюць у тым ліку ў профільныя рэспубліканскія і мясцовыя ведамствы, а таксама іншым прадстаўнікам улады.

Наступная тэма, якая з'явіцца на сайце «Народнай праграмы» днямі, — жыллёва-камунальная гаспадарка.

На канчатковым этапе тэзісныя прапановы па згаданых праблемах увойдуць у праграмы кандыдатаў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Мяркуецца, што да выбаршчыкаў, выкарыстоўваючы планы рэформаў «Народнай праграмы» з лакальнай адаптацыяй, звернуцца бліжэйшымі месяцамі каля 270 кандыдатаў.

**Паводле рух.by**

---

ІНІЦЫЯТЫВЫ

## ІНТЭРАКТЫЎНЫ СОЙМ

Ігар КОКТЫШ

**3 снежня ў Варшаве адбылася прэзентацыя Інтэрактыўнага Сойму InterPolit-Adradžennie, які ўключае ў сябе магчымасці грамадска-палітычнай сацыяльнай сеткі.**

Рэсурс прэзентавалі Зянон Пазьняк (аўтар Канстытуцыі Інтэрактыўнага Сойму InterPolit-Adradžennie), Ігар Коктыш (заснавальнік Інтэрактыўнага Сойму InterPolit-Adradžennie), Зміцер Бародка (каардынатар кампаніі «Разам для Беларусі»).

Дзеля ажыццяўлення мэтаў напісана Канстытуцыя Інтэрактыўнага Сойму, прапанаваны адмысловы механізм — стварэнне Інтэрактыўнага Сойму InterPolit-Adradžennie, які абіраецца самымі ўдзельнікамі рэсурсу і дзейнічае на падставе сваёй прадстаўнічай рэйтынгавай легітымнасці.

Якраз на сябрах Сойму будзе трымацца мэтавая праца па стварэнні тэматыкі і кантэксту абмеркаванняў праблем Беларусі. Функцыя Інтэрактыўнага Сойму — перш за ўсё асветніцкая і салідарная, але з цягам часу і ў залежнасці ад абставінаў ён можа перарасці ў грамадска значнае ўтварэнне.

Зянон Пазьняк падкрэсліў, што ідэалагічнай асновай Інтэрактыўнага Сойму ёсць Адраджэнне — ідэалогія беларускага нацыянальна-вызвольнага руху.

Зміцер Бародка выказаў меркаванне, што «сучасная барацьба за асноўныя дэмакратычныя каштоўнасці прадугледжвае сучасны інструментарый. Інтэрпаліт, як першая нацыянальная сацыяльная сетка, павінны стаць тым сродкам, які дазволіць беларускаму грамадству выйсці на больш якасны ўзровень у сваім змаганні за свабоду і незалежнасць сваёй краіны».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЦІ СТАНЕ ЛУКАШЭНКА НЕЎЯЗНЫМ У МАСКВУ?

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Пакуль увесь свет назірае за падзеямі ў братэрскай Украіне, «сінявокая» павольна, але ўпэўнена рухаецца да шчаслівага Новага года. Святы няўмольна набліжаюцца, і святочны настрой ствараецца не толькі елкамі на плошчах краіны. Урад робіць усё, каб хоць гэтыя святы мы правялі бясклапотна і з добрымі навінамі.**




«Беларуськалій», які быў заціхарыўся пасля скандалу з Баўмгертнерам, адразу пасля ягонай выдачы Расіі запэўніў, што цалкам аднаўляе аб'ём вытворчасці ўгнаенняў. У жніўні 2013 года, пасля развалу беларуска-расійскага калійнага картэлю, ён прыпыніў працу двух з чатырох рудаўпраўленняў.

«На чарговай вытворчай нарадзе кіраўніцтвам прадпрыемства былі пазначаныя вытворчыя планы на бліжэйшы час: у снежні будзе ажыццяўляцца дзейнасць усіх чатырох рудаўпраўленняў», — паведаміў «Інтэрфаксу» прадстаўнік прадпрыемства. Паводле слоў суразмоўцы агенцтва, чацвёртае рудаўпраўленне было запушчана 29 лістапада. Праца трэцяга рудаўпраўлення была адноўленая ў канцы кастрычніка.

Што ж, навіна неблагая. Значыць, праца нашым шахцёрам будзе. А значыць, будзе і заробак да Новага году, і нармальнае свята.

Увогуле, з адпраўкай Баўмгертнера ў Расію шмат што змянілася. Расія, якая раней «зацiснула» нам пастаўку нафты, зараз сама «адкруціла назад». Прэсслужба Міністэрства энергетыкі РФ заявіла, што аб'ём пастаўкі нафты ячшэ ў гэтым годзе дасягне 20,7 мільёна тон. Раней — ну ніяк не пагаджаліся даваць больш за 18,5 мільёна тон.

Аднак у Мінэнерга РФ адмовіліся пракаментаваць матывы, па якіх расійскі бок пагадзіўся павялічыць пастаўкі сыравіны на беларускія заводы. У Мінэнерга РФ толькі паведамілі, што ў тым ліку ў чацвёртым квартале, з улікам зацверджанага дадатковага графіка, пастаўкі трубаправодным транспартам складуць да 3,85 мільёна тон нафты. Раней графік трубаправодных паставак на чацвёрты квартал быў узгоднены ў аб'ёме 3,1 мільёна тон.

Баланс паставак нафты і нафтапрадуктаў з Беларуссю на 2014 год яшчэ не ўзгоднены, тэрмін падпісання адпаведных дакументаў — да 15 снежня гэтага года. Беларусь жадае атрымаць 23 мільёны тон нафты і не супраць пастаўляць нафтапрадукты назад у РФ, але пры гэтым хоча, каб баланс быў падпісаны на ўвесь год, таму што «беларускія НПЗ і расійскія давальцы павінны прагназаваць развіццё бізнэсу на год наперад».

Але не толькі ў Баўмгертнеру, мабыць, справа. Справа ў тым, што Расія, пэўна, спужалася — прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч знайшоў альтэрнатыву расійскаму газу і нафце. Мясніковіч на пасяджэнні прэзідыума Савета Міністраў запатрабаваў, каб усе праекты па мадэрнізацыі прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай галіны былі завершаныя ва ўстаноўленыя тэрміны.

«Сёння дрэваапрацоўка — гэта і наша нафта, і наш газ, — заявіў Міхаіл Уладзіміравіч. — Таму мы павінны не толькі забяспечыць глыбокую перапрацоўку з выхадам на высокую дабаўленую вартасць, але і выгадна прадаць».

Прадаваць, па словах віцэ-прэм'ера Уладзіміра Сямашкі, мы гэта можам той жа Расіі: бо гэта «неабдымны рынак». І не кажыце нам пра тое, што ў Расіі, па-першае, сваіх лясоў хапае, а па-другое, там даўно і стала атабарылася шведская «IKEA».

Канешне, гэты выпадак выключны: «IKEA», якая прынцыпова не дае хабару і «адкатаў», зараз актыўна працуе ў Расіі! Думаю, што пасунуць з рынку такога гульца будзе вельмі няпроста.

Ну, у крайнім выпадку беларускай дрэваапрацоўкай сапраўды можна будзе замясціць газ і нафту, калі пасячы гэтую прадукцыю і закінуць яе ў печку.

Дарэчы, пра хабары — у нас з ім такая ж стабільнасць, як і ва ўсім. Беларусь у 2013 годзе захавала 123-е месца ў Індэксе ўспрымання карупцыі, разлічаным міжнароднай няўрадавай арганізацыяй «Transparency International».

Найменш карумпаванымі краінамі названыя Данія і Новая Зеландыя, якія падзялілі першае месца, і Фінляндыя (3 месца). Найгоршыя паказчыкі — у Афганістана, Паўночнай Карэі і Самалі, што падзялілі 175 месца.

Сярод суседзяў Беларусі лепшыя вынікі ў Польшчы (38 месца), Літвы (43 месца) і Латвіі (49 месца), горш — у Расіі (127 месца) і Украіне (144 месца). Грузія заняла 55 месца, Арменія — 94, Малдова — 102, Кіргізія — 150, Таджыкістан — 154 месца, Туркменія і Узбекістан — на 168 месцы.

Аднак для Аляксандра Рыгоравіча ягоны калега і бліжэйшы паплечнік Уладзімір Пуцін зрабіў вельмі непрыемны падарунак. Пуцін прапанаваў Дзярждуме вярнуцца да тэмы крымінальнай адказнасці за сепаратысцкія выказванні, убачыўшы ў іх пагрозу тэрытарыяльнай цэласнасці гіганцкай шматнацыянальнай краіны.

Профільны камітэт Дзярждумы ў лістападзе адхіліў распрацаваны дэпутатамі з пракрамлёўскай «Адзінай Расіі» законапраект, які ўсталёўвае крымінальную адказнасць за «прапаганду сепаратызму». Але ў аўторак прэзідэнт на сустрэчы са студэнтамі-юрыстамі ў МДУ адказаў на пытанне пра адказнасць для тых, хто разважае пра выгады згубы часткі тэрыторыі Расіі.

«Вядома, трэба адказваць за такія рэчы,— маркуе Пуцін. — Нядаўна я сустракаўся з кіраўнікамі ўсіх фракцый у Дзяржаўнай Думе. І лідар камуністаў Генадзь Андрэевіч Зюганаў прапанаваў увесці крымінальную адказнасць. Гэта трэба абмяркоўваць, у тым ліку на пляцоўцы парламента», — сказаў ён.

Як вядома, Аляксандр Лукашэнка неаднаразова заляцаўся да расійскіх тэрыторыяў. Прычым на апошняй прэс-канферэнцыі з расійскімі журналістамі наўпрост патрабаваў аддаць «сінявокай» Калінінградскую вобласць. «Я кажу часта — аддайце нам Калінінградскую вобласць. Мы кожны гектар, кожную сотку зямлі там будзем араць, і зробім з яе квітнеючы край… Я лічу, што гэта наша зямля. У добрым сэнсе гэтага слова. Я не прэтэндую на тое, каб заўтра забраць Калінінград, але калі можна было б — то з задавальненнем», — казаў Аляксандр Рыгоравіч.

Праўда, акрамя кпінаў у расійскіх сатырычных перадачах, гэтая прамова наступстваў не выклікала. Але зараз беларускі правадыр можа «адказаць за базар», і стаць неўязным у Расію, пад пагрозай апынуцца ў крымінальным пераследзе і пад арыштам — як Баўмгертнер у Мінску. І ўсё гэта са згоды двух лепшых сяброў — Пуціна і Зюганава.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МІКАЛАЙ СТАТКЕВІЧ



У Камітэт па правах чалавека (КПЧ) ААН накіраванае ўжо другое «індывідуальнае паведамленне» (скарга) кандыдата ў прэзідэнты на выбарах 2010 года Мікалая Статкевіча. Інтарэсы Статкевіча ў КПЧ прадстаўляе яго жонка — Марына Адамовіч.

У лютым 2011 года дачка зняволенага Кацярына Статкевіч падала хадайніцтва ў Працоўную групу ААН па адвольных затрыманнях. 19 чэрвеня 2011 года Працоўная група палічыла, што Беларусь парушыла правы Мікалая Статкевіча, і вынесла рашэнне, што пазбаўленне волі Статкевіч з'яўляецца адвольным і ўяўляе сабой парушэнне артыкула 9 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека і артыкула 9 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. Працоўная група заклікала ўрад Беларусі прыняць неабходныя меры для выпраўлення сітуацыі, якія павінны былі ўключаць непасрэднае вызваленне Статкевіча і выплату адэкватнай кампенсацыі.

У новай скарзе ўтрымліваецца просьба да КПЧ ААН аб рэкамендацыі Рэспубліцы Беларусь ліквідаваць наступствы дапушчаных ёю парушэнняў і даць Статкевічу эфектыўныя сродкі прававой абароны, такія, як неадкладнае вызваленне з месцаў пазбаўлення волі, спыненне палітычнага пераследу і поўную рэабілітацыю, а таксама выплату грашовай кампенсацыі.

### УЛАДЗІСЛАЎ ЛАЗАР



Шматпакутны каталіцкі ксёндз Уладзіслаў Лазар вырваўся з турмы КДБ. Ён выпушчаны з сумнавядомай "амерыканкі" пад падпіску аб нявыездзе і належных паводзінах.

Як паведаміла Апостальская нунцыятура ў Рэспубліцы Беларусь, яна была праінфармавана кампетэнтнымі органамі краіны аб тым, што няма больш падставаў для далейшага ўтрымання ксяндза Уладзіслава Лазара ў следчым ізалятары КДБ. Было прынята рашэнне, што падчас следства, якое яшчэ працягваецца, святар павінен знаходзіцца ў пастаянным месцы, маючы свабоду перамяшчэння і дзеяння, паводле вызначаных нормаў, з абавязкам штодзённай рэгістрацыі ў аддзяленні міліцыі.

Пра затрыманне ксяндза стала вядома пасля таго, як Аляксандр Лукашэнка 26 ліпеня паведаміў журналістам, што супрацоўнік беларускіх спецслужбаў затрыманы за працу на замежныя дзяржавы, 29 ліпеня інфармацыю пра затрыманне ксяндза Лазара пацвердзіў прадстаўнік Рымска-каталіцкага касцёла ў Беларусі. Пазней, са спасылкай на Каталіцкі касцёл, стала вядома, што ксяндзу Лазару ставіцца ў віну перадача грошай і матэрыяльных каштоўнасцей чалавеку, які абвінавачваецца ў шпіянажы на карысць іншай дзяржавы.

Шматлікія грамадскія арганізацыі заклікалі міжнародную супольнасць прызнаць Лазара вязнем сумлення.

### АНАСТАСІЯ КАЛІНА



Беларуская зборная па біятлоне атрымала новага сябра каманды, аднак, як высветлілася, не да канца.

Біятланістка зборнай Расіі Анастасія Каліна перайшла ў зборную Беларусі. Каліна патлумачыла прычыну свайго пераходу тым, што, яна папросту выходзіць замуж за беларуса. «Прычына пераходу ў зборную Беларусі? Замуж выходжу за беларуса. Дакладнай даты вяселля не магу назваць. Пераязджаю ў Беларусь і не змагу трэніравацца ў Расіі», — сказала яна. Паводле яе слоў, яна ўжо памяняла грамадзянства і плануе выступіць за Беларусь на другім этапе Кубка свету па біятлоне ў Хохфільцэне.

Раней на адрас Саюза біятланістаў Расіі паступіў афіцыйны ліст ад Беларускай федэрацыі біятлону, у якім гаворыцца аб пераездзе Каліны на сталае месца жыхарства ў Беларусь і атрыманні грамадзянства гэтай краіны. Але СБР накіраваў у Міжнародны саюз біятланістаў афіцыйны запыт з просьбай дэталёва разабрацца ў сітуацыі.

Згодна з Канстытуцыяй Міжнароднага саюза біятланістаў (IBU), спартсменка можа прадстаўляць новую краіну ў спаборніцтвах, калі прайшло, па меншай меры, два гады з таго часу, як яна ў апошні раз прэзентавала сваю ранейшую краіну. У студзені 2013 года Анастасія Каліна была ўказана ў стартавым лісце IBU (спрынтэрская гонка этапу Кубка IBU ў Востраве) у якасці прадстаўніка зборнай Расіі, аднак на лыжню не выйшла. Юрыдычны камітэт IBU вызначыць, ці мае на ўвазе пад сабой тэрмін «указаная ў стартавым лісце» прадстаўленне Расіі на спаборніцтве, альбо такім павінен быць непасрэдны ўдзел у гонцы.

З НАГОДЫ

# МЫ — НЕ БЕЛАРУСЬ!..

◂ Працяг.
Пачатак на стар. 1.

Рэферэндум 1996-га стаў той кропкай адліку, з якой пачаўся аўтарытарны шлях Беларусі. Змянілі канстытуцыю (а дакладней, фактычна прынялі новую). Разагналі дэмакратычна абраны парламент. Усталявалі кантроль над ЦВК і Канстытуцыйным судом.

А далей пайшло… Узмацненне заканадаўства пра палітычныя партыі, што фактычна прывяло іх да паўпадпольнага існавання. Кантроль над грамадскім сектарам і загнанне ў гета незалежных СМІ, якія вымушаны існаваць пад сталым ціскам самацэнзуры. Поўная адсутнасць выбараў розных узроўняў і абсалютны кантроль над выканкамамі і ўрадам.

Карацей, што я вам расказваю, мы ж жывем у адной краіне. Жывем 19 з лішкам гадоў пры адным кіраўніку, які намагаецца зрабіць усё, каб паздзекавацца з нас яшчэ колькі год.

### Народ

Ці адрозніваюцца людзі ва Украіне і ў Беларусі? Безумоўна, усе людзі розныя, у нас розныя тэмпераменты, гістарычныя карані, але галоўнае — у нас розныя ўмовы станаўлення, фармавання і існавання.

Моладзь Украіны гадавалася фактычна ў дэмакратычных умовах. Яна пакуль не ведае, што такое гвалтоўны згон у прадзяржаўную арганізацыю, дабраахвотна-прымусовыя суботнікі, масавыя выключэнне з ВНУ за ўдзел у акцыях пратэсту, прымусовае датэрміновае галасаванне і, нарэшце, прэвентыўныя затрыманні напярэдадні якіх заўгодна акцый пратэсту, і шмат чаго іншага з рэпертуару беларускай улады. І толькі зараз моладзь Украіны даведалася, што нехта можа дубінкай пазбавіць іх законнага права на пратэст, на іншую думку.


Разгон Плошчы–2006. Мінск

Беларуская дэмакратычная моладзь сталела на пратэстах і на дубінках. «Мы — не Беларусь! Мы выйшлі, каб сказаць: мы не баімся, больш нас біць не будуць!» — сказаў 1 снежня «5 каналу» Украіны нейкі хлопец на акцыі ў Данецку.

Выбачайце, хлопцы, але вас, дзякуй Богу, яшчэ і не білі. Вас яшчэ не судзілі за выкрыкванне антыдзяржаўных лозунгаў, нягледзячы на тое, што вы глуханямы. Вас не кідалі ў камеру за супраціўленне міліцыі, хаця ў вас няма абедзвюх ног і рукі. Вас не хапалі наўпрост на вуліцы толькі за тое, што вы пляскаеце ў ладкі. Або апранулі непажаданую майку ці шалік… Ці за тое, што ў вашых руках пабачылі камеру ці фотаапарат. Вам не давалі штрафы за «пікетаванне шляхам фатаграфавання» і за фота ў інтэрнэце, на якім вы выказваеце салідарнасць з такімі ж небаракамі. Вас не кідалі на суткі за тое, што вы прыйшлі сустрэць сяброў, якія толькі што такія ж суткі адбылі. З вас яшчэ не рабілі шпіёнаў. Нарэшце, вас яшчэ не расстрэльвалі як тэрарыстаў.

Усё гэта і яшчэ шмат чаго 17 гадоў на сваім карку адчувала беларуская дэмакратычная грамадскасць. Узгадала гэта — і нават жахнулася… Дзіва, што да гэтага часу беларусы ўсё яшчэ выходзяць на акцыі пратэсту. Спадзяюся, што вы, украінскія хлопцы і дзяўчаты, гэтага не зведаеце. Бо калісьці нам таксама здавалася, што гэтага не можа быць.

Памятаю, як восенню 1996-га тады яшчэ спецкор НТВ Яўген Равенка гучна абураўся, калі яго гвалтоўна выкінулі з кабінета суддзі Цэнтральнага раёна Мінска за тое, што ён хацеў выканаць свой прафесійны абавязак — прысутнічаць на судзе над удзельнікамі акцыі. Ці мог ён уявіць, што ўсяго праз 5 гадоў яго калег з НТВ наогул паб'юць і некалькі гадзін будуць трымаць на тэрыторыі часткі ўнутраных войскаў. Гэтак жа, як і іншых журналістаў і ўдзельнікаў акцыі.

Неяк мая дачка мне сказала: «Я пайшла ў школу — быў Лукашэнка. Я скончыла школу — быў Лукашэнка. Скончыла ўніверсітэт — Лукашэнка. Магістратуру — Лукашэнка. Здаецца, і на пенсію пайду — будзе Лукашэнка». На сваю першую акцыю пратэсту яна выйшла ў 10 гадоў — 15 сакавіка 1999 года — у 5-ю гадавіну Канстытуцыі. Разам з намі ў калоне ішлі ўсе тры спікера ВС (Станіслаў Шушкевіч, Мечыслаў Грыб, Сямён Шарэцкі). У той жа калоне яшчэ ішлі і Віктар Ганчар, і Юрый Захаранка…

### Апазіцыя

Як мы ўжо адзначылі, апазіцыя ва Украіне — сістэмная. То бок, яна знаходзіцца ва ўладных інстытутах і можа актыўна ўздзейнічаць на прыняцце шматлікіх уладных рашэнняў. Некаторыя апазіцыйныя палітыкі нават узначальваюць мэрыі буйных гарадоў, як, напрыклад, Андрэй Садовы, лідар аб'яднання «Самапомач», мэр Львова, які ўжо паабяцаў вывесці на вуліцы ўвесь горад. Лідары буйнейшых апазіцыйных партый (за выключэннем Юліі Цімашэнка) не сядзяць па камерах, а вольна выступаюць на мітынгу на Майдане Незалежнасці, даюць каментары шматлікім тэлеканалам. Больш за тое, яны нават з'яўляюцца дэпутатамі Вярхоўнай Рады Украіны.

Беларусь пра такое ўжо забылася. Апошні раз дзеючыя дэпутаты Вярхоўнага Савета былі на плошчы Незалежнасці і выступалі з прамовамі — усё той жа восенню 1996-га. А нашы апазіцыйныя партыі сёння ўяўляць сабой амаль маргіналізаваную палітычную тусоўку, якая, тым не менш, яшчэ спрабуе нешта зрабіць.

Ці вінаватыя апазіцыйныя лідары ў тым, што сёння ёсць? Безумоўна. Як вядома, «палітыка — гэта мастацтва магчымага». Свае магчымасці беларуская апазіцыя прафукала неадпойчы. Але галоўныя недарэчныя крокі ўсё ж былі зробленыя спачатку — у 1994-м, а потым — у 1996-м. «Праца над памылкамі» беларускай апазіцыі — тэма для асобнага артыкула. Зараз не пра гэта.

Можна колькі заўгодна біць нашу апазіцыю па балючых месцах, але ўжо нічога не вернеш, нічога не зменіш. А за свае памылкі апазіцыйныя лідары ўжо дорага заплацілі — няма ніводнага (бадай, за выключэннем Зянона Пазьняка), хто б мог сказаць: я не сядзеў пры лукашэнкаўскім рэжыме. І толькі за гэта іх можна паважаць. Прынамсі, я іх за гэта паважаю. Асабліва тых, хто дагэтуль за кратамі.

На Майдане Незалежнасці лідар усеўкраінскага аб'яднання «Свабода» Алег Цягнібок заявіў: «Хацеў бы хто тагі ці не, але ва Украіне пачалася рэвалюцыя!» Будзем спадзявацца, што ўкраінцы здолеюць утрымаць сваю краіну на дэмакратычным шляху, што іх апазіцыя не наробіць памылак, а ўлада — не будзе ўзмацняць гвалт.

Будзем спадзявацца, што і Беларусь дачакаецца другога прэзідэнта, нашы дзеці больш не будуць сядзець па турмах за свае погляды, а апазіцыйныя лідары нарэшце будуць гатовыя ўзяць на сябе ўсю адказнасць. Колькі ж можна?!

ВЫБАРЫ

# ЦІ ДАЧАКАЕМСЯ САПРАЎДНАЙ ДЭМАКРАТЫІ?

Сяргей ПУЛЬША

**Лукашэнка фактычна даў старт перадвыбарчым кампаніям. На сустрэчы з Лідзіяй Ярмошынай была прызначана дата першай з іх. Мясцовыя выбары пройдуць 23 сакавіка 2014 года.**

Вельмі дзіўнай выглядае рытарыка сустрэчы. Найперш, Лукашэнка заявіў, што выдатна ведае пра планы апазіцыі. Нават больш выдатна, чым яна сама. «Справа ў тым, што сітуацыя няпростая, і нашы альтэрнатыўныя палітыкі, назавем іх так, не будзем крыўдзіць іх заступнікаў за мяжой, вельмі разлічваюць вось на гэты прамежак. Яны плануюць, што выбары ў мясцовыя саветы — гэта будзе нейкі пачатак, развіццё, а апагею так званая дэмакратыя дасягне ў прэзідэнцкія выбары і скончыцца гэта парламенцкімі выбарамі», — пазначыў Лукашэнка расклад.

Дзіўна не тое, што ён агучыў звычайны працэс: у любой краіне мясцовыя выбары служаць трамплінам для выбараў больш вышэйшага ўзроўню і шмат у чым вызначаюць гэты выбар. Дзіўна, што не было сказана ані слова пра «дэстабілізацыю», «адмарозкаў», а «пятая калона» раптам ператварылася ў «альтэрнатыўных палітыкаў». І нават пра сваё ж вызначэнне таго, што «палітык у Беларусі адзін», кіраўнік дзяржавы забыўся. Аказалася, ёсць альтэрнатыва.

Што ж адбылося з Аляксандрам Рыгоравічам?

Ды нічога асаблівага. Сітуацыя так прыціснула, што зараз нельга не заўважаць «альтэрнатыўнае» меркаванне. У эканоміцы паўсюль праваў. Ды і ў палітыцы прыходзіцца перахопліваць «альтэрнатыўныя» ідэі. Варта было разгарнуцца ініцыятыве «Народны рэферэндум», як была прыдуманая падстава для такога ж самага рэферэндуму, але з боку ўлады. Задуманая судовая рэформа з аб'яднаннем гаспадарчых і грамадскіх судоў немагчымая без зменаў Канстытуцыі, а такія змены могуць быць прынятыя толькі на рэферэндуме. І ніхто не сумняваецца, што гэтая рэформа — толькі падстава для таго, каб прысабечыць ініцыятыву некаторых апазіцыйных структураў.



Дарэчы, Лукашэнка ў схаванай форме пацвердзіў: можа быць, разам з прэзідэнцкімі выбарамі пройдзе і рэферэндум. «Тут мы павінны ў рукі народу аддаць усё для таго, каб народ сам вызначыўся, хто будзе кіраваць ім і дзяржавай, як будзе развівацца краіна і ў якім кірунку. Гэта маё жалезнае меркаванне», — празрыста намякнуў кіраўнік дзяржавы.

«Як будзе развівацца краіна і ў якім кірунку» — гэта пытанні, пагадзіцеся, менавіта рэферэндуму. Прынамсі, у 1995 годзе на рэферэндум выносілася пытанне аб падтрымцы дзеянняў, накіраваных на эканамічную інтэграцыю з Расіяй. У 2015 годзе гэтаму пытанню будзе 20 гадоў. За гэты час вырасла новае пакаленне беларусаў, і прыярытэты ў іх могуць быць іншыя.

Аналагічнае пытанне на рэферэндуме можа быць шчаўчком па носе як Еўропе, так і Расіі, асабліва, калі большасць выкажацца за незалежнасць Беларусі і яе абстрагаванне ад абодвух бакоў, па прынцыпу Швейцарыі. Рэферэндумам можна тарпедаваць якія заўгодна ініцыятывы — і Мытны саюз, і Еўразійскі эканамічны саюз, і шмат чаго яшчэ. Канешне, такія пытанні рызыкоўныя, Расія можа адключыць газ і ўключыць «Хроснага бацьку», але хто не рызыкуе, той не выйграе.

Да таго ж, Лукашэнка разумее, што, разам з выбарамі, прыйдзецца вырашаць і магутныя эканамічныя пытанні. А праца на два франты будзе вельмі цяжкай. «Страціць тры гады для развіцця краіны (2014, 2015 і 2016) у гэты перыяд будзе катастрафічна. Таму выбары будуць вельмі сур'ёзнымі. Мы сур'ёзна павінны да гэтага перыяду рыхтавацца. І хацелася б, каб гэтыя выбары сталі дэманстрацыяй праўдзівай дэмакратыі», — запатрабаваў беларускі кіраўнік.

Што такое «праўдзівая дэмакратыя» па-беларуску, усе мы ведаем — гэта не менш за 80% падтрымкі дзейснай улады. Таму забяспечваць чарговую «элегантную перамогу» будуць праверaныя кадры.

Для гэтага ўсё зроблена: забаронены байкот выбараў, забароненыя сацыялагічныя апытанні і гэтак далей. У любым выпадку Аляксандр Лукашэнка можа сцвярджаць — гэта законы ў нас такія, а я з імі зрабіць нічога не магу. Так што на выбары ўлада ідзе арганізаванай і ўзброенай. Але вельмі няўпэўненай.

ПРАВАВЫ ЛІКБЕЗ

# НАШЫ ПРАВЫ — НАША БАГАЦЦЕ

Міхаіл ПАСТУХОЎ, Сяргей ПУЛЬША




**10 снежня ўвесь цывілізаваны свет адзначае Дзень правоў чалавека. Ён святкуецца па прапанове Генеральнай Асамблеі ААН штогод, пачынаючы з 1950 года.**

У савецкія часы ў шматлікіх камедыйных фільмах на любое бяспраўе з боку чыноўнікаў героі адказвалі: «Я паскарджуся ў ААН!». Гэта было нейкім вызначэннем органа, які, нібыта, разглядае ўсе скаргі, з'яўляецца аўтарытэтам вышэйшай інстанцыі. Потым фраза: «Паскардзься ты хоць у ААН!» набыла крыху грэблівае значэнне: нібыта, аспрэчвай вырак — не аспрэчвай, усё роўна праўды не даб'ешся. Але зараз шматлікія беларусы праходзяць ААН. І дабіваюцца па сваіх справах вышэйшага выраку.

На чым грунтуюцца абавязацельствы Беларусі перад гэтай структурай? Якія міжнародныя правы існуюць у Беларусі і як іх можна бараніць?

## Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека

Мы ўжо казалі (НЧ, №40 ад 25 кастрычніка г.г.), што па беларускай Канстытуцыі чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі з'яўляюцца вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы. Таксама мы канстатавалі, што ў нашай дзяржаве правы чалавека абвяшчаюцца, але не забяспечваюцца. Як жа прымусіць дзяржаву выконваць свае абавязкі?

Першы міжнародны дакумент у гэтай справе — Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека (УДПЧ).

Ідэя падрыхтоўкі ўніверсальнага акта ў галіне правоў чалавека атрымала распаўсюд пасля Другой сусветнай вайны. Камісія ААН па правах чалавека з'явілася ў 1946 годзе менавіта для распрацоўкі такога акту. Узначаліла яе Элеанора Рузвельт, жонка прэзідэнта ЗША, а яе намеснікам стаў вядомы французскі юрыст, спецыяліст у галіне правоў чалавека Рэне Касэн.

Першапачатковы праект Дэкларацыі быў падрыхтаваны на працягу года і накіраваны для абмеркавання дзяржавам — сябрам ААН. Не ўсе з ім пагадзіліся. ЗША і краіны Заходняй Еўропы прапаноўвалі замацаваць у ёй толькі артыкулы аб грамадзянскіх і палітычных правах. СССР і яго сатэліты, у тым ліку БССР і УССР, настойвалі на ўключэнні ў тэкст Дэкларацыі эканамічных і сацыяльных правоў, расцэньваючы іх як «сацыялістычную дактрыну правоў чалавека». Ну проста як зараз Аляксандр Лукашэнка, для якога галоўныя правы чалавека — права на працу і жыллё.

У выніку Дэкларацыя, прынятая 10 снежня 1948 года, стала сапраўды ўніверсальным і «ўсеагульным» дакументам аб правах чалавека, якая адлюстравала падыходы як краінаў капіталізму, так і сацыялізму.

І таму асноўныя правы чалавека ў Дэкларацыі вызначаюцца ў «трохступеннай паслядоўнасці».

## Грамадзянскія правы

Першая ступень — гэта грамадзянскія правы. Да такіх адносяць, напрыклад, права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць; права на свабоду ад катаванняў або жорсткага, бесчалавечнага або зневажальнага годнасць абыходжання і пакарання; права на роўнасць перад законам і на роўную абарону; права на эфектыўнае аднаўленне ў правах; права на свабоду ад адвольнага арышту, затрымання або выгнання; права на адкрыты, з захаваннем усіх патрабаванняў справядлівасці, судовы разгляд крымінальнай справы; права лічыцца невінаватым да таго часу, пакуль віна не будзе ўстаноўлена ў выніку публічнага судовага разбору, пры якім асобе забяспечваюцца ўсе магчымасці для абароны.

Да гэтай катэгорыі адносяцца таксама права на свабоду ад неабгрунтаванага ўмяшання ў асабістае і сямейнае жыццё, права на недатыкальнасць жылля, тайну карэспандэнцыі; права на свабоду перамяшчэння і выбар месца жыхарства ў межах дзяржавы, права пакідаць краіну і вяртацца назад; права шукаць прыстанак ад пераследу ў іншых краінах; права на свабоду думкі, сумлення і рэлігіі.

Варта зазначыць, што гэтыя правы належаць кожнаму чалавеку, незалежна ад грамадзянства і іншых прыкмет. Яны носяць неад'емны характар: з імі чалавек нараджаецца і памірае. Гэта — асабісты «капітал» чалавека, на які дзяржава не мае права замахвацца, акрамя выпадкаў, калі для гэтага ёсць законныя і дастатковыя падставы.

## Палітычныя свабоды

Палітычныя свабоды чалавека — гэта права на свабоду перакананняў і іх свабоднае выказванне, права на свабоду шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю і ідэі любымі сродкамі незалежна ад дзяржаўных межаў; права на свабоду мірных сходаў; права на аб'яднанне ў асацыяцыі; права прымаць удзел у кіраванні дзяржавай непасрэдна ці праз свабодна выбраных прадстаўнікоў.

У Дэкларацыі падкрэсліваецца, што воля народа павінна быць асновай улады ўрада. Гэта воля павінна знаходзіць сваё выяўленне ў перыядычных і нефальсіфікаваных выбарах.

## Іншае і парадак дзейнасці

Што тычыцца блоку сацыяльна-эканамічных і культурных правоў чалавека, то ва УДПЧ да іх адносяцца права на працу, на свабодны выбар работы, на справядлівыя і спрыяльныя ўмовы працы і на абарону ад беспрацоўя; права на роўную аплату за роўную працу; права ствараць прафсаюзы і ўступаць у прафсаюзы для абароны сваіх інтарэсаў; права на сацыяльнае забеспячэнне і на ажыццяўленне правоў у эканамічнай, сацыяльнай і культурных галінах; права на адукацыю; права на свабодны ўдзел у культурным жыцці грамадства.

Артыкул 28 прадугледжвае, што кожны мае права на грамадскі і міжнародны парадак, пры якім ягоныя правы і свабоды могуць быць цалкам ажыццёўлены. То бок, гаворка ідзе пра рэальнае ажыццяўленне ў кожнай краіне асноўных правоў і свабод чалавека.

У артыкуле 29 гаворыцца, што кожны чалавек мае перад грамадствам (*але не перад дзяржавай — аўт.*) пэўныя абавязкі. Тут жа замацоўваецца норма аб магчымых абмежаваннях правоў і свабод чалавека, якія павінны ўсталёўвацца толькі законам і выключна «з мэтай забеспячэння належнага прызнання і павагі правоў і свабод іншых і задавальнення справядлівых патрабаванняў маралі, грамадскага парадку і агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадстве».

У завяршальным артыкуле 30 падкрэсліваецца, што ніводнае і ніякае палажэнне УДПЧ не можа тлумачыцца такім чынам, што дзяржаве, групе асоб або асобным людзям дазваляецца ўчыняць дзеянні, накіраваныя на знішчэнне правоў і свабод, выкладзеных у Дэкларацыі.

Падкрэслю, што я прыводжу «выбраныя правы», якія часцяком парушаюцца беларускай дзяржавай. Поўны тэкст УДПЧ можна зараз знайсці дзе заўгодна — ад інтэрнэту да любой бібліятэкі.

## А што ў нас?

Варта прызнаць, што абсалютная большасць нормаў Дэкларацыі ў нас не выконваюцца, хоць і абвяшчаюцца на ўзроўні Канстытуцыі і законаў. У Беларусі людзі толькі нараджаюцца свабоднымі і роўнымі, а калі падрастаюць, то часцяком губляюць свабоду і годнасць у адносінах з уладай. Яны не роўныя ў залежнасці ад мовы, рэлігіі, палітычных і іншых перакананняў, нацыянальнага і сацыяльнага паходжання, маёмаснага і іншага становішча.

Прычым, часцяком гэтыя парушэнні «перасякаюцца». Напрыклад, беларускі закон аб рэлігіі, прыняты насуперак пратэстам вернікаў у 2002 годзе, абавязвае рэгістраваць рэлігійныя ўстановы. Для рэгістрацыі такой установы патрабуецца 20 чалавек, а любы іх сход — гэта ўжо незарэгістраваная рэлігійная дзейнасць. То бок, парушаецца права на свабоду перакананняў, на свабоду мірных сходаў, на аб'яднанне.

У перашкодах стварэнню незалежнага прафсаюзу на прадпрыемстве «Граніт» — аж да звальнення ініцыятараў гэтай справы — з боку дзяржавы было парушана права на аб'яднанне, «савецкае» права на стварэнне і ўступленне ў прафсаюз, а таксама для некаторых — права на працу.

Прысуд «тэрарысту» Уладзіславу Кавалёву быў абскарджаны ў Камітэце па правах чалавека ААН, і Камітэт вырашыў — у дачыненні да Кавалёва былі парушаныя ягоныя агульначалавечыя правы, а таксама міжнародныя дамовы Беларусі. Прынамсі, было прымяненне фізічнай сілы; прымус да дачы паказанняў супраць сябе; парушэнне прэзумпцыі невінаватасці. Акрамя таго, у ААН лічаць, што суд не з'яўляўся незалежным і бесстароннім.

Рэальнасць такая, што грамадзяне Беларусі не маюць права на жыццё, на свабоду і асабістую недатыкальнасць. Яны без усялякіх падстаў могуць стаць ахвярамі самавольства з боку ўладаў і не могуць абараніць свае правы ўнутры краіны.

Прэтэнзіі да беларускіх уладаў, зыходзячы з палажэнняў Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, можна працягнуць. Галоўная з гэтых прэтэнзій — органы ўлады не выконваюць сваіх абавязацельстваў перад грамадзянамі.

## Непрамое дзеянне

Галоўная хіба ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека — у тым, што яна не з'яўляецца абавязковым дакументам. Адзіным наступствам у выпадку парушэння Дэкларацыі можа быць толькі выказванне недаверу з боку міжнароднай супольнасці.

Але існуе і шэраг іншых метадаў уздзеяння на беларускія ўлады ў кантэксце міжнародна-прававых дамоваў. Пра тое, што з абавязковага не выконвае Беларусь і што абавязвае яе выконваць правы чалавека — чытайце ў наступнай частцы.

МЕРКАВАННЕ

# МЫ — КЛАНДАЙК АРХАІКІ

**Светапогляд чалавека фармаваўся стагоддзямі і пакаленнямі. Показкі пра тое, што беларусы — людзі хутару і балота, таму і ментальнасць наша своеасаблівая, — не пустыя словы. Прастора фармуе чалавека, а чалавек прастору. Вывучэннем гэтых узаемасувязяў ужо больш за дваццаць гадоў займаецца навуковец, этнолаг Уладзімір Лобач. Ён, да слова, вядомы сваім надзвычай акуратным падыходам да народнай культуры ды адмоўным стаўленнем да любых спробаў яе спрашчэння. Пра архаіку і містыку, якія не маюць намеру знікаць, чытайце ў гутарцы Уладзіміра Лобача і Вольгі Хвоін.**



Фота аўтара

Уладзімір Лобач — Беларускі этнолаг, спецыяліст у галіне этнасеміётыкі. Аўтар больш чым 150 навуковых артыкулаў, прысвечаных сімвалічна-рытуальным аспектам беларускай традыцыйнай культуры, міфалогіі, семантыкі культурнага ландшафту і сакральнай геаграфіі. Ад 1992 года праводзіць палявыя даследаванні Паўночнай Беларусі.

***— Цяпер пануе куткаплынная інфармацыйная эпоха. Этнаграфія ж — навука грунтоўная і разважлівая. Вы працуеце для навукоўцаў ці ўсё ж гэта знаходзіць водгук, цікаўнасць у больш шырокага кола?***

— Жыццё паказвае, што цяпер чалавеку мегаполіса часта становіцца сумна ды смутна і хочацца нечага свайго, унікальнага. Свая краіна, свая традыцыя пакуль ёсць нерасчытаным тэкстам. Таму этнаграфічная навука запатрабаваная не толькі ў акадэмічным асяродку, але і ў людзей, якія спрабуюць разабрацца, хто яны і што маюць свайго ў глабалізаваным свеце. Калі меркаваць з уласнага вопыту, нішто так моцна не сацыялізуе, не дае грамадзянскага разумення, як этнаграфічныя экспедыцыі. Яны дзейнічаюць на парадак больш эфектыўна за лозунгі і мітынгі.

***— Дапамажыце, калі ласка, яшчэ раз прад'явіць доказы, што Беларусь — не маленькая краіна. Распавядзіце пра адрозненні ў светапоглядзе беларусаў з розных куткоў краіны.***

— Традыцыйная культура ёсць дыяментам з сотнямі граняў. Свая каларыстыка ёсць у Падзвінні, Падняпроўя, Палесся... Мяне часта пытаюцца, які раён найбольш спадабаўся ў экспедыцыях. Я спецыялізуюся на Падзвінні, гэта — Полацкі, Віцебскі, Вушацкі, Гарадоцкі, Пастаўскі раёны. Іх неакрэтна параўноўваць, бо кожны — адметны. Я нават са шкадаваннем усведамляю, што жыццё не хопіць, каб спазнаць усе асаблівасці нашай краіны. Так, паўночны беларус выхаваны суворай прыродаю. Ён не надта гаваркі, стрыманы ў паводзінах. Тым не менш гасцінасць паўночных беларусаў шчырая. Госць у хату — Бог у хату, гэта пра іх. Паўднёвыя беларусы больш тэмпераментныя, больш жэстыкулюючы, нават хуткасць маўлення ў іх вышэйшая.

Моцна ўплывае на рэгіянальныя адметнасці канфесійны




**Міф. Прастора. Чалавек: Традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / Уладзімір Лобач. — Мінск : Тэхналогія, 2013.**

Манаграфія прысвечана семантыцы і рытуальнай функцыянальнасці базавых элементаў традыцыйнага культурнага ландшафту беларусаў, як прыроднага, так і антрапагеннага паходжання ў сістэме іх узаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці. На падставе шырокага кола этнаграфічных, фальклорных, лінгвістычных крыніц ахарактарызаваны касмаганічныя заканамернасці фармавання і касмалагічныя параметры жыццёвай прасторы беларусаў, якія знайшлі сваё ўвасабленне ў міфапаэтычнай карціне свету і адлюстраваныя ва ўсіх праявах традыцыйнай духоўнай культуры этнасу.

чыннік. Праваслаўе скрозь пальцы глядзела на многія рэчы, да якіх касцёл ставіцца нецярпіма. Паказальна, што большасць культавых крыніц патрануюцца царквою. Для касцёла гэта не тыпова. Калі мы запісваем фальклор у каталіцкай частцы Беларусі, то колькасць і змест запісаў значна бяднейшыя, чым у праваслаўнай. Напрыклад, я чуў водгукі каталікоў на традыцыю абеду на могілках: «Якая дзікасць — трапеза на могілках!» Але што аднаму дзікасць, тое другому магчымасць паяднацца з продкамі. У праваслаўных пахавальна-памінальная традыцыя больш архаічная.

***— Вы закранулі тэму хрысціянства. І тут узнікае пытанне: як жа склалася, што ў краіне цесна перапляліся паганства і хрысціянства, бо ў тых жа замовах знахарак амаль заўсёды фігуруе Божая Маці?***

— Гэта акурат указвае на сапраўдную моц і трываласць традыцый, бо канфлікт у падобных сітуацыях мала што вырашае і стратны для абодвух бакоў. Калі паглядзець на тое ж ушанаванне крыніц, то складана развесці, што першасна для людзей: шанаванне вады ці хрысціянскай капліцы, якая над ёй стаіць. І мясцовыя жыхары не зразумеюць падобнага пытання, бо важна і тое, і другое. Кожная знахарка скажа, што яна шчырая верніца, у яе хаце ёсць абразы. Хаця змест замоваў абсалютна архаічны і да хрысціянства не мае ніякага дачынення.

***— А ці звярталіся вы самі па дапамогу да знахарак?***

— Так, быў выпадак. І сапраўды дапамагло. Дзякуй Богу, гэтаму пакуль не знайшлі тлумачэння. Калі параўноўваць традыцыю тысячагадовага знахарства і сучаснай афіцыйнай медыцыны, то гэта несувымерныя на часе галіны. Спрабаваць патлумачыць рэчы, якія выспявалі тысячагоддзямі, заўчасна. І я б не раіў ставіць эксперыменты на гэтай глебе, ёсць даволі трагічныя прыклады падобных спробаў. Не трэба з дапамогаю знахаркі лекаваць сучасныя хваробы. Ведаю, калі спрабавалі анкалогію лячыць знахарствам, быў сумны вынік. Хірургічныя праблемы мусіць лячыць хірургія.

> Доўгі час беларусы былі этнасам няпоўнай сацыяльнай структуры. Беларускасць захоўвалася ў сялянскім асяродку, што кансервавала яе, а працэсы ўрбанізацыі маштабна закранулі Беларусь толькі ў другой палове XX стагоддзя

***— Знахарства як з'ява знікае? Хто становіцца на замену вясковым бабулям, якія ведалі, як загаварыць зубы і вылечыць рожу?***

— Адбываюцца фенаменальныя рэчы. Некалькі дзесяцігоддзяў таму знахары абслугоўвалі аднавяскоўцаў ці людзей з суседніх вёсак. Цяпер жа я бачыў чэргі з гарадскіх машын. Бо дзеці гэтых бабуль з'ехалі ў горад, і туды ж завезлі сваю інфармацыю пра знаёмых знахароў. Больш таго, рассаднікам знахарскіх ведаў сталі бальніцы, дзе збіраюцца пажылыя людзі з аднолькавай ментальнасцю і аднолькавымі праблемамі.

Часта даводзіцца чуць: «Ляжала ў бальніцы, і адна баба дала мне спісаць замову». Раней гэтаму вучылі сваякі ці аднавяскоўцы, цяпер абсалютна чужыя людзі. У Шумілінскім раёне дырэктарка школы з гонарам казала, што, як мама стане слабай, яна пяройме яе веды. Цяпер для знахароў ёсць своеасаблівая праблема — каму перадаць гэтыя веды, бо іх нельга забіраць з сабою. І часта ахвотна гэтым дзеляцца з тымі ж этнографамі.

***— Носьбіты традыцыйнай культуры паступова сыходзяць. Ці можна гаварыць пра тое, што яе чакае лёс выключна музейнага экспаната?***

— Першая мая экспедыцыя была ў 1992 годзе. Мы запісвалі бабулек 1902–1905 гадоў нараджэння. З «маладухамі» 1930-х гадоў нараджэння не бачылі асабліва сэнсу размаўляць. Цяпер жа нашы рэспандэнты — людзі акурат гэтых 1930-х гадоў. На маю думку, пакуль ёсць жывая вёска з яе асаблівым, адрозным ладам жыцця, усё гэта будзе існаваць.

***— Хто да нас бліжэй, паводле культурнага набытку з прадстаўнікоў еўрапейскай сям'і народаў?***

— Шмат паралеляў можна знайсці з балтамі — літоўцамі, латышамі. Культураю расійскай Поўначы, маю на ўвазе найперш Пскоўшчыну, якая вельмі архаічная. Падняпроўе, Усходняе Палессе бліжэй да Украіны. Цяпер экспедыцыі з Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі актыўна прыязджаюць у Беларусь. Мы — Кландайк архаікі, што не захавалася ў суседзяў. Доўгі час беларусы былі этнасам няпоўнай сацыяльнай структуры. Беларускасць захоўвалася ў сялянскім асяродку, што кансервавала яе, а працэсы мадэрнізацыі-ўрбанізацыі маштабна закранулі Беларусь толькі ў другой палове дваццатага стагоддзя.

***— Ёсць шэраг народных забабонаў, як то не хадзіць на Узвіжанне ў лес, не рабіць працу ў Вялікдзень, на Звеставанне. Адкуль іх карані, і ці сапраўды гэта важна выконваць?***

— Чым свята, а не «празнік» кшталту Дня рэвалюцыі, адрозніваецца ад будзённага дня? Будні даюцца чалавеку, каб рэалізаваць свае ўтылітарныя патрэбы, зарабіць на хлеб і масла. Свята даецца, каб быў час задавальняць духоўныя патрэбы. Я не магу сказаць, ці жалезна будзе пакаранне за працу на Каляды. Але агучаныя прадпісанні падкрэсліваюць высокую ступень духоўнасці нашых людзей, хаця можа падавацца, што беларусы выключна практычныя людзі. Нават нягледзячы на нейкія пертурбацыі, як то часы вайны, свята заставалася святам.

## Слоўнік некаторых паняццяў

**Каўтун** — гэта рэальная, а не міфічная хвароба, вядомая па ўсёй Еўропе. Раней яе звязвалі з кепскімі ўмовамі жыцця, антысанітарыяй. Сучасныя даследаванні паказалі, што падставаю ёсць нервовае ўзрушэнне, пасля чаго валасы блытаюцца, і іх немагчыма расчасаць, мае месца галаўны боль. Выпадкі каўтуна зафіксаваныя і ў XIX стагоддзі. Яго лячэнне — парафія знахарак. Але трэба разумець, што знахаркі — не дактары, а хутчэй добрыя псіхатэрапеўты, бо нават тып камунікацыі, тэмп і тэмбр голасу, звароту адпаведныя: «Дзетка»...

**Сурокі** — гэта амаль аналаг рускага «сглазу». Але не зусім. Хвароба «з вока». Сурокі маюць многа катэгорый. Надумныя — калі нехта не проста паглядзеў, але найперш пажадаў благое. Падзіўныя — чалавек без задняй думкі пахваліў, але ў благую хвіліну, тут вераванне пра добры і благі час. Сурокі цыганскія, жыдоўскія — вынік узаемадзеяння з чужынцамі.

**Замова** — вербальная формула, якая запускае механізм лекавання чалавека. У замове няма ніводнага лішняга слова. Замовы вельмі архаічныя і паводле зместу, і паводле рытмікі. Нельга размяжоўваць знахара і замову. Але трэба, каб чалавек, які гаворыць гэтыя словы, меў адпаведны дар.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 9 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### Беларусь 1

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.25** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.00** Прыгодніцкая камедыя «Астэрыкс і Абелікс. Місія «Клеапатра» (Францыя - Германія).
**12.10, 14.55, 18.35** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Дзень у вялікім горадзе.
**13.25** Клуб рэдактараў.
**14.10** Вакол планеты.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Журналісцкае расследаванне.
**15.55** Заўтра - гэта мы!
**16.25** Усё як мае быць!
**16.50** Камедыйны мюзікл «Залатая Рыбка» (Расія).
**19.20** Арэна.
**19.40, 23.05** «Зона Х». Крымінальныя навіны.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Сваты-6» (Украіна). 1-я серыя.
**22.55** Актуальнае інтэрв'ю.
**23.45** Дзень спорту.
**23.55** Дэтэктыўны трылер «Сустрэчнае расследаванне» (Францыя).

### ОНТ

**06.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закрытая школа». Шматсерыйны фільм.
**12.10** Прэм'ера. «Яны і мы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05** Трылер «Сотавы».
**23.50** «Вячэрні Ургант».
**00.30** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.45** «Вялікі сняданак».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** «Джэймі ў сябе дома».
**13.00** «Глядзець усім!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** СТБ прадстаўляе: «Зорны рынг. Новы сезон.
**15.45** «100 адсоткаў».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Вялікія таямніцы».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** Фільм «Ультрафіялет» (ЗША, 2006 г.).
**22.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Ваенная таямніца».
**00.40** «Знахар». Серыял.

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**12.25** Дакументальны фільм «Цярновыя вянкі Алімпу» («Беларусьфільм»).
**12.55** Камедыя «Паласаты рэйс» (СССР).
**14.40** Фантастычны баявік «Затура: касмічная прыгода» (ЗША).
**16.40** Беларуская часіна.
**17.55** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**18.55** Дэтэктыўны серыял «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава» (Расія) . 1-2 серыі.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.35** Камедыйна-парадыйны серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**23.40** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».

### Беларусь 3

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Год у гісторыі».
**08.20** «Цуды прыроды». Чэхія. Куба. Фіджы.
**08.55** «Камертон». Піяніст Сяргей Тарасаў.
**09.20** «Палескі пачастунак». Салёнае сала.
**09.35** «Раскол». 20-я серыя.
**10.20** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.50** «Тры таварышы». Мастацкі фільм.
**12.05** «Калейдаскоп».
**12.10** «Год у гісторыі».
**12.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Пятра Падкавырава.
**12.55** «Аўтограф».
**13.20** «Сінематэка». Аляксандр Яфрэмаў.
**14.05** «Карані».
**14.35** «Свет прыроды». Воўк па мянушцы Тэр.
**14.45** «Пейзажы скрозь час». Ван Гог у Сен-Рэмі дэ Праванс.
**15.15** «Рэйнджэр з атамнай зоны». Мастацкі фільм.
**16.40** «Наперад у мінулае».
**17.10** «Летуценні Я.Драздовіча». Пра вядомага беларускага мастака.
**17.30** «Росчырк часу». Касцёл Святога Станіслава ў Магілёве.
**17.50** «Лабірынты». Каханне ў жыцці і творчасці М.Багдановіча. Часткі 1-я і 2-я.
**18.40** «Калейдаскоп».
**18.50** «Валерый Чкалаў». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.45** «Давай ажэнімся». Мастацкі фільм.
**22.05** «Дыя@блог». «Пра мову».
**22.30** «Замах». 1-я серыя.
**23.15** «Аўтограф».
**23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Пятра Падкавырава.
**0.10 «Калейдаскоп».**
**0.15 «Год у гісторыі».**

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**09.35, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.10** «Гатуем».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Вышук-2».
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30** «Асноўны закон».
**00.30** «Песня для Вашага століка».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**06.35** Мультфільмы.
**07.05** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.15** Мастацкі фільм «Удачлівая».
**10.35** Праграма «Па-руску кажучы...».
**11.00** Выніковая праграма «Разам».
**11.45** Праграма «Агульны рынак».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дак. фільм «У свеце мінулага».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Ток-шоў «Слова за слова».
**16.20** Тэлесерыял «Жаночы раман».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Праграма «Беларусь сёння».
**19.00** Тэлесерыял «Паляванне на ізюбра».
**21.00** Навіны Садружнасці.
**21.25** Праграма «Акцэнты».
**21.40** Дакументальны фільм «Рэальны свет».
**22.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**23.00** Тэлесерыял «Красная плошча».
**00.40** Праграма «Па-руску кажучы...».
**01.05** Мастацкі фільм «Не прывыкайце да цудаў».
**02.30** Тэлесерыял «Клон».
**04.10** Дакументальны фільм «Рэальны свет».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма). Погляд на падзеі тыдня вачыма журналістаў радыё «Свабода».
**07.30** «Фядора, якая лечыць», рэпартаж, 2010 г., Беларусь.
**07.50** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.15** «Дом», серыял: 13 серыя.
**18.00** «Кароль-вінароб», серыял: 7 серыя.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Пінгвінік Пік-Пок», мульсерыял.
**19.00** Навіны.
**19.15** Агляд медыяў.
**19.20** Агляд падзеяў культуры.
**19.25** Дэвайс.
**19.30** Навіны.
**19.40** Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**19.55** рэпартаж «Euronews».
**20.00** Навіны.
**20.30** Два на два (тэледыскусія): Сяргей Чалы і Дзмітрый Ісаёнак.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Фільматэка майстроў: «Костка», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**22.55** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Няміга», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**23.30** Аб'ектыў.

## 10 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

### Беларусь 1

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**10.05** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.00** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**12.10, 14.55** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Дзень у вялікім горадзе.
**13.25** Нашы.
**13.40** Серыял «Сваты-6». 1-я серыя.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Джамайка».
**16.25** Арэна.
**16.45** «Здароўе». Ток-шоў.
**17.35** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**19.40, 23.15** «Зона Х». Крымінальныя навіны.
**19.55** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.45** Серыял «Сваты-6». 2-я серыя.
**22.55** Сфера інтарэсаў.
**23.55** Дзень спорту.
**00.05** Серыял «Джамайка».

### ОНТ

**06.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольны закуп».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закрытая школа». Шматсер.фільм.
**12.10** Прэм'ера. «Яны і мы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Наша Беларуша».
**18.50** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. Шматсер. фільм «Адліга».
**23.25** «Вячэрні Ургант».
**00.05** Фільм «Дача».
**01.45** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**09.00** «Вялікія таямніцы».
**10.00** «Глядзець усім!».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Жаданая». Серыял.
**12.30** «Джэймі ў сябе дома».
**13.00** «Цэнтральны рэгіён».
**13.50** Фільм «Ярык» (Расія, 2007 г.).
**15.30** «Дзіўная справа».
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Нам і не снілася».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** Фільм «Малады майстар» (Ганконг).
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** СТБ прадстаўляе: інтэлект-шоў «Разумней не прыдумаеш».
**00.00** «Аўтапанарама».
**00.25** «Знахар». Серыял. Закл. серыі.

### Беларусь 2

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.15** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.15** Вышэй за дах.
**12.15** Дэтэктыўны серыял «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**14.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**15.30** Камедыйна-парадыйны серыял «Рэальныя мальцы» (Расія).
**16.40** Беларуская часіна.
**17.55** Серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**18.55** Дэтэктыўны серыял «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава» (Расія) . 3-4 серыі.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Прамая трансляцыя.
**00.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.

### Беларусь 3

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Галасы з мінулага».
**08.15** «Год у гісторыі».
**08.30** «Аляксандр Мядзведзь». Чалавек-легенда. Дакументальны фільм.
**09.05** «Пейзажы скрозь час». Амерыканскія імпрэсіяністы ў Олд Лайме.
**09.30** «Замах». 1-я серыя.
**10.15** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**10.45** «Валерый Чкалаў». Мастацкі фільм.
**12.20** «Калейдаскоп».
**12.25** «Галасы з мінулага».
**12.35** «Год у гісторыі».
**12.50** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Віктара Шматава.
**13.15** «Аўтограф».
**13.45** «Бусляня». Кароткаметражны фільм.
**14.30** «Душа мая з іменем жаночым. Элаіза Ажэшка». Дакументальны фільм.
**14.50** «Струны прасторы і часу». Генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзімір Пракапцоў.
**15.15** «Давай ажэнімся». Мастацкі фільм.
**16.35** «Палескі пачастунак». Юшка.
**16.50** «Скарбніца Міншчыны». Заслаўе. Спаса-Праабражэнская царква.
**17.20** «Спецыяльны рэпартаж». Творчасць ансамбля «Сябры».
**17.35** «Там, дзе пракладзены шлях». Гісторыя трамвая ў Санкт-Пецярбурзе.
**18.05** «Альманскія балоты». Асаблівасці балот Палескай нізіны.
**18.35** «Калейдаскоп».
**18.45** «Галасы з мінулага».
**18.50** «Пецярбургская ноч». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Наш чалавек у Сан-Рэма». Мастацкі фільм.
**22.30** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.55** «Замах». 2-я серыя.
**23.40** «Аўтограф».
**00.10** «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Віктара Шматава.
**00.35** «Калейдаскоп».
**00.40** «Галасы з мінулага».
**00.45** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Вышук-2».
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30** Серыял «Нядзеля ў жаночай лазні».
**00.25** «Песня для Вашага століка».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**06.35** Мультфільмы.
**07.05** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.15** Мастацкі фільм «Хакеісты».
**10.55** Праграма «Па-руску кажучы...».
**11.20** Праграма «Навіны Садружнасці Культура».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дак. фільм «У свеце цудаў».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Ток-шоў «Слова за слова».
**16.20** Тэлесерыял «Жаночы раман».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Праграма «Саюзнікі».
**19.00** Тэлесерыял «Паляванне на ізюбра».
**21.00** Навіны Садружнасці.
**21.25** Праграма «Акцэнты».
**21.40** Дак. серыял «Рэальны свет».
**22.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**23.00** Тэлесерыял «Красная плошча».
**00.35** Праграма «Па-руску кажучы...».
**01.00** Мастацкі фільм «Рабро Адама».
**02.25** Тэлесерыял «Клон».
**04.05** Дак. фільм «У свеце цудаў».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.30** Два на два (тэледыскусія).
**08.55** Аб'ектыў.
**18.00** «Праўда Хатыні», дак. фільм, 2008 г.
**18.35** Моўнік: Нам пішуць.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**19.15** Агляд медыяў.
**19.20** Агляд падзеяў культуры.
**19.25** Рэпартаж «Euronews».
**19.30** Навіны.
**19.40** Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**19.50** Рэпартаж «Euronews».
**20.00** Навіны.
**20.30** Беларусы ў Польшчы.
**20.45** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма): Вайна 1812 года.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Анатомія ад'езду», дак. фільм, 2012 г.
**21.40** «Вікі Крыстына Барселона», камедыя, 2008 г., ЗША.
**00.20** МакраФон.
**01.20** Аб'ектыў.

## 13 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.20, 08.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 01.10** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Меладраматычны серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**10.10** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**11.10** Тэлестужка АТН «Кінафэст класу «Лістапад».
**12.10, 14.55, 18.35** Evrovision. Без каментароў.
**12.15** Дзень у вялікім горадзе.
**13.25** Нашы.
**13.35** Серыял «Сваты-6». 4-я серыя.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Серыял «Джамайка».
**16.30** Дакументальны цыкл «Жыццё - праклятая роля» (Расія).
**17.30** Серыял «Сэрца Марыі» (Расія).
**19.20, 00.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.50** Серыял «Такое звычайнае жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.45** Нашы.
**21.55** Фантастычны баявік «Армагедон» (ЗША).
**01.25** Дзень спорту.
**01.35** Серыял «Джамайка».

### ОНТ

**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе. «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольны закуп».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Закрытая школа». Шматсер. фільм.
**12.10** Прэм'ера. «Яны і мы».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прысуд».
**15.00** Прэм'ера. «У адным кроку ад Трэцяй сусветнай».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Зразумець. Прабачыць».
**17.00** «У наш час».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** АНТ прадстаўляе: «Чакай мяне. Беларусь».
**18.55** Поле цудаў.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Вячэрні Менск».
**22.25** «Што? Дзе? Калі? у Беларусі».
**23.40** АНТ прадстаўляе: фільм «Мех: уяўны партрэт Дыяны Арбус».
**01.50** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**09.00** «Нам і не сніласся».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40** «Прошаная вячэра».
**11.35** «Жаданая». Серыял.
**12.30** «Джэймі ў сябе дома».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.50** Фільм «Да вас прыйшоў анёл» (Расія, 2004 г.).
**15.45** «Якія людзі!».
**16.50** «Згодна з законам».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Такі лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** 1/2 Фіналу Першай лігі МС КВЗ.
**22.00** СТБ прадстаўляе: вячэрняе шоў «На тым жа месцы ў той жа час».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** СТБ прадстаўляе: вячэрняе шоў «На тым жа месцы ў той жа час». Працяг.
**23.55** «Ежа багоў».
**00.50** Еўрапейскі покерны турнір.
**01.40** Фільм «Федэральная абарона» (ЗША, 2001 г.).

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Дэтэктыўны серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**10.15** Пад грыфам «Вядомыя».
**10.55** Дэтэктыўны серыял «Следства вядзе Да Вінчы» (Канада). Заключная серыя.
**12.45** Дэтэктыўны серыял «Пятроўка, 38. Каманда Сямёнава» (Расія) . 5-я і 6-я, заключная, серыі.
**14.55** Дак. фільм «Аўгустоўскі канал».
**15.10** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування» (Аўстралія). Закл. серыя.
**15.45** Беларуская кухня.
**16.20** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Дэтэктыўны серыял «Я - целаахоўнік» (Расія).
**19.00** Рамантычная камедыя «Бізнэс дзеля кахання» (ЗША).
**20.45** Гумарыстычная праграма «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне» (Расія).
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** «Бітва экстрасэнсаў». Шоў-праграма.
**22.40** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.35** Хакей. КХЛ.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**07.30** «Дабраранак».
**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Год у гісторыі».
**08.20** «Запаведнай сцежкай». Заказнік «Карачэўскі мох».
**08.50** «Пясняр Нарачанскага краю». Жыццё і творчасць народнага паэта Беларусі Максіма Танка.
**09.20** «Палескі пачастунак». Бабулін гаршчочак.
**09.35** «Замах». 4-я серыя.
**10.20** «Сіла веры».
**10.50** «Леначка і вінаград». Мастацкі фільм.
**11.35** «Калейдаскоп».
**11.40** «Год у гісторыі».
**11.55** «Свята далёкай зоркі». Памяці жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Валяр'яны Канстанцінаўны Жолтак.
**12.25** «Аўтограф».
**12.55** «Карані».
**13.25** «Халады ў пачатку вясны». Каротка-метражны фільм.
**13.55** «Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі - смелы прапаведнік імя Хрыстова». Жыццё і творчасць выдатнага рускага пісьменніка.
**14.20** «Анёл на мачце». Дакументальны фільм пра лёс нямецкага карабля.
**14.45** «Цуды прыроды». Ізраіль.
**15.15** «Дунечка». Мастацкі фільм.
**16.55** «Камертон». Кампазітар і спявак Ігар Карнялюк.
**17.20** «Музеум». Партрэты сям'і Весялоўскіх.
**17.35** «Майстры і чаляднікі». Ткачыхі.
**18.05** «Звоняць, адчыніце дзверы!». Творчасць рэжысёра, народнага артыста Расіі Аляксандра Міты.
**18.30** «Скарбніца Берасцейшчыны». Шэпт старога парку. Гісторыя мястэчка Скокі.
**18.55** «Калейдаскоп».
**19.05** «Прыватнае жыццё Пятра Вінаградава». Мастацкі фільм.
**20.30** Калыханка.
**20.50** «Рыфмуецца з любоўю». 1-2 серыі.
**22.30** «Сіла веры».
**22.55** «Замах». 5-я серыя.
**23.40** «Аўтограф».
**00.10** «Свята далёкай зоркі». Памяці жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Валяр'яны Канстанцінаўны Жолтак.
**00.35** «Калейдаскоп».
**00.40** «Год у гісторыі».

### НТВ

**06.00** «НТБ раніцай».
**08.40, 10.20** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа лекараў».
**15.15** «Справа густу».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**19.35** «Жыццё як песня: Андрэй Губін».
**21.15** Вострасюжэтны фільм «Уцекачы».
**23.00** Серыял «Нядзеля ў жаночай лазні».
**00.40** «Авіятары».

### МИР

**05.00** Тэлесерыял «Галоўныя ролі».
**06.35** Мультфільмы.
**07.05** Праграма «Цік-так».
**07.20** Тэлесерыял «Заручальны пярсцёнак».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Мастацкі фільм «Іншы».
**10.55** Праграма «Па-руску кажучы...».
**11.20** Праграма «Сардэчна запрашаем».
**11.45** Праграма «Рэспубліка сёння».
**12.00** Навіны Садружнасці.
**12.25** Тэлесерыял «Клон».
**14.10** Дакументальны фільм «У свеце каменных джунгляў».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.25** Ток-шоў «Яшчэ не разам».
**16.20** Тэлесерыял «Жаночы раман».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.25** Мастацкі фільм «Папялушка з райскай выспы».
**20.00** Праграма «Любімыя акцёры».
**20.25** Мастацкі фільм «На Дзерыбасаўскай добрае надвор'е, ці На Брайтан Біч ізноў ідуць дажджы».
**22.10** Мастацкі фільм «Кінгсайз».
**00.05** Праграма «Прыгоды Македонскай: Зроблена ў Кітаі».
**00.20** Праграма «Па-руску кажучы...».
**00.45** Мастацкі фільм «Куфар Марыі Медычы».
**02.20** Тэлесерыял «Клон».
**03.50** Праграма «Народы Расіі».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**08.55** Аб'ектыў.
**18.00** «Ранча», серыял: 31 серыя.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Дзіўны свет ката Філімона».
**19.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**19.15** Агляд медыяў.
**19.20** Агляд падзеяў культуры.
**19.25** Дэвайс.
**19.30** Навіны.
**19.40** Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова / С. Калінкінай.
**19.50** рэпартаж Алеся Залеўскага.
**20.00** Навіны.
**20.25** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Нямiга», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** «Дом», серыял: 14 серыя.
**22.55** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**23.25** Аб'ектыў.

## 14 СНЕЖНЯ, СУБОТА

### 1 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Камедыя «Зігзаг поспеху» (СССР).
**08.30** Існасць.
**09.00** Навіны.
**09.10** Зямельнае пытанне.
**09.35** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі...» (Расія).
**11.30** Заўтра - гэта мы!
**12.00** Навіны.
**12.10** Здароўе.
**13.00** Усё як мае быць!
**13.35** Нашы.
**13.45** Таямніцы следства.
**14.15** Вакол планеты.
**15.00** Навіны.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Дакументальны цыкл «Жыццё - праклятая роля» (Расія).
**16.30** Давярай і правярай.
**17.05** «Гісторыя «Славянскага базара».
**18.35** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**19.00** Навіны.
**19.10** Камедыйная меладрама «Сапраўднае каханне» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Рамантычная камедыя «Лары Краун» (ЗША).
**23.30** Дзень спорту.
**23.40** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі...» (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе. «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Смешарыкі». Новыя прыгоды.
**09.20** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.10** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.00** Прэм'ера. «Андрэй Макарэвіч. Машына яго часу».
**14.00** «Два колеры страсці». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Абмен жонкамі».
**17.30** «Адгадай мелодыю».
**18.00** АНТ прадстаўляе: «Бацькоў у школу!».
**19.05** «Хвіліна славы. Дарога на Алімп!».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сёння ўвечар».
**22.55** «Паспець да паўночы».
**23.35** «Што? Дзе? Калі?».
**00.50** «Андрэй Макарэвіч і «Аркестр Крэольскага танга».

### СТВ

**06.00** «Next-3». Серыял.
**06.50** «Анфас».
**07.05** Фільм «Сафі» (Канада, 2010 г.).
**09.00** «Чыстая праца».
**10.00** «Іншая краіна».
**10.50** «Уявіце сабе».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Прыгоды дылетанта».
**12.40** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.40** Фільм «Дзе знаходзіцца нафелет?» (СССР, 1987 г.).
**15.20** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** «Дзіўная справа».
**18.30** СТБ прадстаўляе: інтэлект-шоў «Разумней не прыдумаеш».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Прарок» (ЗША, 2007 г.).
**22.05** СТБ прадстаўляе: «Зорны рынг. Новы сезон.
**23.20** Фільм «Каханне жыве тры гады» (Францыя - Бельгія, 2012 г.).
**01.05** «Глядзець усім!» .

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.15** Мультфільмы.
**08.00** Фільм-казка « Прыгоды жоўтай валізкі» (СССР).
**09.20** Тэлебарометр.
**09.25** Беларуская кухня.
**10.00** «СуперІнтуіцыя. Бітва палоў». Забаўляльная шоў-праграма (Расія).
**11.15** «Бітва экстрасэнсаў». Шоў-праграма (Расія).
**12.25** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**13.55** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**15.05** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**17.35** Гумарыстычная праграма «Жаночая ліга. Хлопцы. Грошы. Каханне» (Расія).
**18.10** «Імперыя песні». Народнае караоке-шоў.
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.15** Цудоўная сямёрка. Другі эпізод. Фігурнае катанне.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** КЕНО.
**21.05** «Дыскатэка 80-х у Алімпійскім» (Расія). Канцэрт.
**22.55** «СуперІнтуіцыя. Бітва палоў». Забаўляльная шоў-праграма (Расія).
**00.00** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**00.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ.

### 3 БЕЛАРУСЬ

**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Абіцель душы».
**08.35** «Кожны мае права быць розным».
**09.00** Дзіцячы фільм. «Канёк-Гарбунок».
**10.25** «Без эпітафіі». Пісьменнік і грамадскі дзеяч Зміцер Жылуновіч (Цішка Гартны) і яго трагічны лёс.
**11.15** «Наперад у мінулае».
**11.40** «Калейдаскоп».
**11.50** «Вежы Навагрудка». Дакументальны фільм.
**12.00** «Метафара». Работы скульптара Уладзіміра Жбанава.
**12.30** «Прарыў». Дакументальны фільм пра ўдзельнікаў аперацыі «Баграціён».
**12.50** «Белавежскі бондар». Дакументальны фільм.
**13.05** «Настальжы». Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Сяргей Журавель.
**13.30** «Салаўіная рака». Навукова-папулярны фільм.
**13.55** «У пушчах Палесся». Опера Анатоля Багатырова паводле аповесці Я.Коласа «Дрыгва».
**15.55** «Калейдаскоп».
**16.00** «Немец». 1-я - 6-я серыі.
**18.10** «Калейдаскоп».
**20.30** Калыханка.
**20.50** Сусветнае кіно. «Таямніца старога лесу».
**22.50** «Без права на дубль». Мурат Насыраў.
**23.40** «АРТиШОК».
**00.05** «Калейдаскоп».

### НТВ

**06.25** Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**08.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**08.20** «Агляд».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.25** «Справа густу».
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Я худнею».
**14.15** «ДНК». Ток-шоў.
**15.10** «Холад». Навуковае расследаванне.
**16.00** «Лепшы горад Зямлі».
**16.50** «Следства вялі...».
**17.40** «Вочная стаўка».
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.50** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.55** «Ты не паверыш!».
**21.55** «Выспа».
**23.25** Баявік «Гром лютасці».
**01.00** «Прамень Святла».

### МИР

**05.00** Гарадскі раманс.
**06.45** Мультфільмы.
**07.50** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**08.05** Праграма «Мільён пытанняў пра прыроду».
**08.20** Праграма «Эксперыментатары».
**08.35** Праграма «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Праграма «Свет Спорту».
**09.40** Праграма «Даведнік».
**10.05** Праграма «Зроблена ў СССР».
**10.30** Мастацкі фільм «Шчыт і меч».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.10** Мастацкі фільм «Шчыт і меч».
**16.30** Тэлесерыял «Дом на набярэжнай».
**20.20** Праграма «Навіны Садружнасці Культура».
**21.00** Мастацкі фільм «Няма чаго дэкларавыць».
**22.50** Мастацкі фільм «Золата Кальджата».
**00.20** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**00.35** Тэлесерыял «Дом на набярэжнай».
**04.20** Праграма «Даведнік».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Інфармацыйна-публіцыстычны блок.
**08.25** Невядомая Беларусь: «Кіпіць Нямiга», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**09.00** Аб'ектыў.
**18.00** Беларусы ў Польшчы.
**18.15** «Царква на мяжы», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**18.40** Забавы «Ліпі і Мэсі».
**18.50** Калыханка для самых маленькіх: «Пацукі».
**19.00** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**19.30** «Кар'ера Нікодэма Дызмы», серыял, 1980–2000 гг., Польшча: 1 серыя.
**20.25** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Каханкі маёй мамы», маст. фільм,1985 г., Польшча.
**22.55** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**23.40** МакраФон: «Рок-карона–2008»: Канцэрт гурта «Ляпіс Трубяцкі».
**00.10** Аб'ектыў.

## 15 снежня, надзеля

### 1 Беларусь

**07.15** Камедыйная меладрама «Сапраўднае каханне» (Расія).
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Арсенал.
**09.35** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі...» (Расія).
**11.35** БеларусьLIFE.
**12.10** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**12.40** Каробка перадач.
**13.15** «XXL WOMAN TV. Жаночы часопіс».
**13.45** Terra incognita. Беларусь невядомая.
**14.15** Клуб рэдактараў.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Медычныя таямніцы.
**16.10** Evrovision. Вынікі тыдня.
**16.25** Давярай і правярай.
**17.00** Камедыя «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях» (Францыя - Германія).
**19.05** Камедыйны мюзікл «Новыя прыгоды Аладына» (Расія).
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Журналісцкае расследаванне.
**22.35** Авантурная камедыя «Кіраванне гневам» (ЗША).
**00.30** Камедыйны серыял «Калі ў вас няма цёткі...» (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе. «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** «Смешарыкі. ПІН-код».
**09.35** «Шалапутныя нататкі».
**09.55** «Пакуль усе дома».
**10.50** «Фазэнда».
**11.25** «Вясельны перапалох».
**12.25** АНТ прадстаўляе: «Брэйн-рынг».
**13.30** Прэм'ера. «Раманавы».
**14.35** Прэм'ера. «Андрэй Макарэвіч. Зменлівы свет».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны кактэйль».
**17.40** АНТ прадстаўляе: «Рассмяшы коміка».
**18.50** АНТ прадстаўляе: «Я люблю Беларусь!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Ледавіковы перыяд».
**00.50** Фільм «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд».

### СТВ

**06.05** «Next-3». Серыял.
**07.40** «100 адсоткаў».
**08.10** Фільм «Прарок» (ЗША, 2007 г.).
**10.00** «Аўтапанарама».
**10.30** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман».
**11.30** «Вялікі сняданак».
**12.10** «Добры дзень, доктар».
**12.45** Фільм «Дзяўчына без адрасу» (СССР, 1957 г.).



**14.35** «Тэрыторыя памылак».
**16.00** «Цэнтральны рэгіён».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Канцэрт М.Задорнава.
**17.40** «Аўтапанарама».
**18.10** СТБ прадстаўляе: вячэрняе шоў «На тым жа месцы ў той жа час».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Прэм'ера! Фільм «Тэрэза» (Францыя, 2012 г.).
**22.50** «Якія людзі!».
**23.50** Фільм «Месяц» (Вялікабрытанія, 2009 г.).
**01.35** «Дакументальны праект».

### 2 Беларусь

**07.20** Мультфільмы.
**08.15** Фільм-казка «Прынц і жабрак» (СССР).
**09.30** Тэлебарометр.
**09.35** Прыгодніцкі баявік «Піраты XX стагоддзя» (СССР).
**11.20** «Дыскатэка 80-х у Алімпійскім» (Расія). Канцэрт.
**13.10** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**14.10** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**15.15** Біятлон. Кубак свету. Гонка праследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**16.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА.
**17.00** Фільм-фэнтэзі «Пудра» (ЗША).
**19.15** Суперлато.
**20.25** Навіны надвор'я.
**21.00** Спортлато 5 з 36.
**21.05** КЕНО.
**21.10** Рамантычная камедыя «Маленькая чорная кніжка» (ЗША).
**23.15** Камедыйны серыял «Таксі» (Украіна).
**00.10** Хакей. КХЛ.
**02.10** Спорт-кадр.

### 3 Беларусь

**08.00** «Калейдаскоп».
**08.05** «Таямніца душы».
**08.35** «Кожны мае права быць розным».
**09.00** «АРТиШОК».
**09.35** «Эцьен. Вяртанне». Дакументальны фільм пра лёс разведчыка Льва Маневіча.
**10.05** «Маладосць мая...» Дакументальны фільм пра былога саліста ансамбля «Песняры» - Леаніда Барткевіча.
**10.35** «І ў сэрцы цэлы свет». Дакументальны фільм пра класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулю.
**10.50** «Ілюзіён». Дакументальны фільм пра архітэктуру Масквы 30-х-50-х гадоў.
**11.10** «Калейдаскоп».
**11.20** «Немец». 1-я - 6-я серыі.
**13.30** «Калейдаскоп».
**15.50** «Без права на дубль». Мурат Насыраў.
**16.35** Дзіцячы фільм. «Канёк-Гарбунок».
**17.55** «Культпрасвет».
**18.25** Сусветнае кіно. «Таямніца старога лесу».
**20.30** Калыханка.
**20.50** Святочны канцэрт прысвечаны заснаванню Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. Дырыжор Віктар Бабарыкін.
**22.15** «Культпрасвет».
**22.40** «Тарцюф». Спектакль Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра па творы Ж.-Б.Мальера.
**0.10 «Калейдаскоп».**

### НТВ

**06.25** Дэтэктыўны серыял «Дарожны патруль».
**08.00, 10.00, 13.00** Сёння.
**08.20** «Медыцынскія таямніцы».
**08.50** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.20** «Дачны адказ».
**11.25** «Паедзем, паямо!».
**11.55** «Цуд тэхнікі».
**12.30** «Першая перадача».
**13.20** Серыял «Груз».
**16.40** «Лепшы горад Зямлі».
**17.30** «Вочная стаўка».
**18.25** Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.45** Фільм «Ганчакі: апошні палёт Чкалава».
**00.15** «Віктар Зінчук. Юбілей у Крамлі».
**01.10** «Школа зласлоўя».

### МИР

**05.00** Мастацкі фільм «4:0 на карысць Танечкі».
**06.35** Мультфільмы.
**07.50** Праграма «Таямніцы Эрмітажа».
**08.05** Праграма «Ведаем рускую».
**09.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Праграма «Зямля і неба».
**09.35** Праграма «Прыгоды Македонскай: зроблена ў Кітаі».
**09.50** Праграма «Са свету па нітцы».
**10.10** Мастацкі фільм «Колер шафрана».
**13.10** Мастацкі фільм «Іншы».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.10** Ток-шоў «Яшчэ не разам».
**15.45** Тэлесерыял «Запіскі экспедытара таемнай канцыляріі».
**20.00** Выніковая праграма «Разам».
**21.00** Тэлесерыял «Запіскі экспедытара таемнай канцыляріі».
**23.30** Мастацкі фільм «Няма чаго дэклараваць».
**01.25** Мастацкі фільм «Колер шафрана».
**04.20** Праграма «Зямля і неба».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.15** Казкі для дзетак: «Пінгвінік Пік-Пок», «Прыгоды Ціўкі», «Занатоўкі натураліста».
**08.05** «Калі сэрца ў чаканні», серыял: 16-17 серыі.
**08.30** «Каханкі маёй мамы», маст. фільм, 1985 г., Польшча.
**18.00** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**18.30** Моўнік (лінгвістычная праграма): Знявечаная мова зямлі.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Пацукі».
**19.00** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**19.30** «Час гонару», серыял: 64 серыя.
**20.15** Дакументальная гадзіна: «Токіа ад золку да змяркання», дак. фільм, 2011 г., Польшча.
**21.00** Фільматэка майстроў: «Смерць як луста хлеба», маст. фільм, 1994 г., Польшча.
**23.00** «Кароль-вінароб», серыял: 8 серыя.
**23.45** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).

---

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы Час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго, падпісацца можна ў офісе і ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў.

| | |
|---|---|
| Гомель | (8 029) 697 82 75 Аляксандр; |
| Магілёў | (8 029) 930 79 22 Міхась; |
| Мінск | (8029) 178 31 68 Вольга; |
| Бабруйск | (8029) 628 75 01 Вольга; |
| Слуцк | (8029) 364 42 60 Зінаіда. |

### Паважаныя чытачы!

Кошт аднаго нумара газеты — 2000 руб., аднаго месяца — 8000 руб. Дзякуй вам за разуменне і падтрымку!

Запрашаем да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл. +375 29 986 38 05**

ф. ПС 112

БЕЛПОЧТА

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ____
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ____

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема ______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | |

Плательщик

Кассир

Пеня ______
Всего ______

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы Час
www.novychas.info

РАЗВАЖАННІ




# ВЯРТАННЕ МАЙДАНУ

Алег НОВІКАЎ

**Паўмільённая маніфестацыя ў Кіеве зноў абвастрыла палітычны крызіс ва Украіне. Чаму нашы суседзі ў такой колькасці выйшлі на вуліцы?**

Прыкладна а 2-й гадзіне ў ноч на суботу, 30 лістапада, на Майдане прадстаўнікі апазіцыі пачалі дэмантаж сцэны і гукавой апаратуры. Гадзінай раней спявачка Руслана і галоўны спікер Еўрамайдану заявіла, што ў яе баліць горла і ёй трэба да лекара. Прыкладна ў той жа час Майдан пачалі пакідаць народныя дэпутаты ад апазіцыі.

Эвакуацыя выглядала цалкам лагічнай. На думку шмат каго, улада здолела дамагчыся адносна стабільнай ізаляцыі палітычнай апазіцыі ад ключавога кантролю над Еўрамайданам, апагеем чаго стаў еўрамайданаўскі месідж: «Нам не патрэбны прэзідэнт з тых, хто не мёрз з намі на Майдане, мы высунем прэзідэнта са сваіх». Фактычна, адміністрацыя Януковіча дамаглася таго, чаго жадала: дэпалітызавала Майдан. Ніякіх табе адставак прэзідэнта, ураду і Вярхоўнай Рады. Рэгіяналы добра папрацавалі са студэнцкімі лідарамі, падкінуўшы ім ідэю — Майдан без партый.

У гэты час можна было з упэўненасцю казаць, што рэсурс праекту згас, і максімум праз дзень Майдан сам па сабе спыніць сваё існаванне.

Аднак раптам сітуацыя рэзка мяняецца: прыкладна а 4-й гадзіне студэнты і байцы «Беркута» ўступілі ў канфлікт. У выніку ўдзельнікі акцыі былі жорстка збітыя. Аператыўна выкладзеныя ў сеціва здымкі выклікалі шок. Ужо ў той жа дзень людзі самастойна пачалі падцягвацца на Міхайлаўскую плошчу, і да вечара там ужо сабралася некалькі дзясяткаў тысяч чалавек. На наступны дзень на вуліцы выйшла некалькі сотняў тысяч пратэстоўцаў. У цэнтры ўкраінскай сталіцы зноў з'явіліся намёты. У дадатак захопленыя адміністратыўныя памяшканні. На Хрышчаціку выраслі барыкады. Еўрамайдан атрымаў новае дыханне.

Прычыны масавай мабілізацыі ўкраінцаў тлумачаць па-рознаму. Самая папулярная версія — рэакцыя на гвалт. «У першыя гадзіны не было часу, нават і жадання раскладваць усё па палічках і спрабаваць аналізаваць падзею, бо ў мяне, як і ў большасці грамадзян, у мозгу стукала і крычала адно — такое прабачаць нельга, за такія рэчы трэба лінчаваць як выканаўцаў, так і арганізатараў», — піша адзін з кіеўскіх блогераў.

Менавіта да тэзісу «выпадкова перагнулі палку» намагаецца звесці пратэст улада. Адзін з праўладных парталаў тлумачыць палітычны момант: «Сотні тысяч людзей выйшлі на вуліцу, па-першае, таму, што для іх відавочна — міліцыя не павінна збіваць бяззбройных грамадзян. Гэта галоўнае, а не дамова пра асацыяцыю. Бо сур'ёзных крывавых сутыкненняў ва Украіне не было ўсе гады незалежнасці. У тым ліку і з-за гэтага мы худа-бедна пераносілі нашых палітыкаў. І гэта людзі гатовыя адстойваць. Застаецца дадаць, што Віктар Януковіч ужо асудзіў разгон і паабяцаў пакараць вінаватых».

У гэтым плане варта згадаць набіраючую папулярнасць канспіралагічную версію падзей 30 лістапада. Адпаведна ёй, усё тое, што адбылося на Майдане, — ёсць спланаваная аперацыя, з мэтай ажыццяўлення чарговага палацавага перавароту. Ні для каго не сакрэт, што ўсярэдзіне самой Партыі рэгіёнаў ужо даўно існуюць вельмі сур'ёзныя супярэчнасці, звязаныя з тым, што не ўсім хапае бюджэтнага пірага, не кажучы пра пратэсты супраць рэйдарства, якое практыкуе клан Януковіча. Быццам, адна з фракцый палацавай апазіцыі арганізавала правакацыю з «Беркутам». Быццам, не дарма адначасова ў Партыі рэгіёнаў актывізавалася так званая групоўка Фірташа. Гэта прыкладна 12 дэпутатаў. Іх выхад з фракцыі Партыі рэгіёнаў можа паставіць пытанне пра парламенцкую большасць і лёс ураду. Адным словам, мела месца правакацыя з мэтай паслабіць Сям'ю і пад шумок прыбраць да рук яе актывы.

На думку некаторых палітолагаў, новую хвалю пратэстаў можна лічыць следствам таго, што абвеяная марамі 60 працэнтаў украінскага грамадства еўраінтэграцыя была адкладзеная ў Вільнюсе на нявызначаны час. Сапраўды, у шмат каго пасля Вільнюсу ўзнікла вострае адчуванне несправядлівасці. Маўляў, ашукалі. Прычым гэта была абраза мільёнаў людзей. Як слушна заўважыў адзін з украінскіх левых сайтаў: «Нестабільнасць жыцця ў краіне перыферыйнага капіталізму прымушае верыць у цудоўнае выратаванне. У мінулы раз такім цудам быў «народны прэзідэнт» Юшчанка, які абяцаў, што «багатыя падзеляцца з беднымі». Зараз цудоўным выратаваннем уяўляецца далучэнне да «еўрапейскага раю».

Прагненне Еўропы ў дадзеным выпадку наклалася яшчэ на крызіс іміджу гаранта. Гісторыя вакол Еўраасацыяцыі давяла шмат каму, наколькі Януковіч не лічыцца з простымі людзьмі, і нават са сваім атачэннем, якое было ўпэўненае, што Асацыяцыя

> «У першыя гадзіны не было часу раскладваць усё па палічках і аналізаваць падзею, у мяне, як і ў большасці грамадзян, у мозгу стукала і крычала адно — такое прабачаць нельга»

будзе падпісаная. Украіна рэзка мяняе геапалітычныя арыенцір на працягу аднаго дня пад уплывам невядомых фактараў. Гэта, на думку шмат каго, недапушчальна для палітыка, які ўвасабляе ўсю сістэму. Януковіч «кінуў» — і таму павінен сысці.

Аднак, калі нават дыпламаты Януковіча ў хуткім часе даб'юцца прарываў на еўрапейскім фронце, гэта не абяцае ўнутранай стабілізацыі. Не толькі таму, што праект імклівай інтэграцыі Украіны з ЕС — хімера. Проста само патрабаванне еўраінтэграцыі стала своеасаблівай парафразай лозунгу: «Далоў уладу алігархаў!». Украіна перажывае цяжкі эканамічны крызіс на фоне росту маштабнай карупцыі і працэсаў культурнай і сацыяльнай дэзінтэграцыі. Па іроніі гісторыі, большасць незадаволеных аб'яднаў еўрапейскі міф. Менавіта гэтым тлумачыцца масавасць праеўрапескіх акцый, іх растучая падтрымка ў электаральных бастыёнах Партыі рэгіёнаў. Ясна, што сацыяльны антыалігархічны пратэст не знікне, нават калі Украіна атрымае дарожную карту інтэграцыі ў еўраструктуры.

Вялізарны маштаб акцый супраць Януковіча таксама звязваюць з нейкімі ментальнымі кодамі ўкраінскага народа. Януковіч, які пасля Вільнюсу пачаў новы флірт з Масквой, абудзіў фобіі магчымай страты незалежнасці. «Шматлікія ўкраінцы ўсвядомілі, што апошнія манеўры ўлады не проста аддаляюць нас ад нейкай там еўрапейскай будучыні. Яны губляюць краіну, якая ад гэтага можа разляцецца на кавалкі. Краіну, якая здолела выжыць у межах ад Львова да Луганску, ад Чарнігава да Крыму насуперак усім прагнозам. І што заўтра мы можам прачнуцца ў Маларасійскай, Наварасійскай і якой-небудзь Таўрычаскай губерні, а таксама ў Галіцкім ваяводстве. І вось гэту Краіну людзі таксама гатовыя адстойваць», — дзеліцца сваімі думкамі адзін з дэманстрантаў. Не дарма ваяўнічая нацыяналістка Ірына Фарыён падзякавала Януковічу за тое, што ён сваёй прамаскоўскай палітыкай аб'яднаў Украіну.

Праўда, калі казаць пра асаблівасці калектыўнай псіхалогіі ўкраінцаў, то трэба працытаваць і аднаго з модных кіеўскіх інтэлектуалаў, які пабачыў у еўрапейскіх закліках мазахічнае жаданне атрымаць еўрапейскага цывілізаванага пана. «Еўрамайдан не жадае радыкальных змен (звяржэння ўлады Януковіча), а, хутчэй, банальна свайго «еўрапейскага» пана... Проста Еўрамайдан або саромеецца, або цынічна хавае сваё жаданне пра гэта заявіць уголас», — піша ён.

Пакуль інтэлектуалы дыскутуюць, палітычны крызіс працягваецца. Апазіцыя намагаецца вынесці вотум недаверу ўраду, мабілізаваць больш валанцёраў на блакаду ўрадавага кварталу, дабіцца ў якасці ўмоў перамоваў вызвалення Цімашэнка. Улада ў сваю чаргу кансалідуе шэрагі, заручаючыся падтрымкай рэгіянальных эліт усходу і поўдня, намагаецца працаваць у штатным рэжыме, каб не выклікаць ілюзію дэзынтэграцыі сваіх інстытутаў. Мяркуючы па ўсім, на Банкаўскай маюць намер дачакацца, калі Еўрамайдан–2 сам па сабе дыскрэдытуецца, як Еўрамайдан–1. Своеасаблівым тэстам на перспектывы Майдану–2 могуць стаць пазачарговыя парламенцкія выбары на пяці акругах, якія прызначаны на 15 снежня.

## ЯНЫ ПРА УКРАІНУ

Украіны ў ЕС не будзе да тых часоў, пакуль Расія не наладзіць станоўчыя і не вельмі багатыя на тэстастэрон стасункі з Захадам. Ад прэзідэнта Пуціна чакаць гэтага не даводзіцца... Менавіта Пуцін проста-такі ў д'ябальскай манеры прапанаваў трохбаковыя перамовы пра лёс Украіна, нібыта на двары 1939 год, і тэрыторыі можна дзяліць гэтак жа, як тое калісьці зрабілі Гітлер і Сталін.

**«Süddeutsche Zeitung» (Германія)**

Сам Януковіч справакаваў падзеі на вуліцах украінскай сталіцы. Памылкай прэзідэнта быў загад разагнаць мітынгоўцаў, і памылкай стала ўзяцце на сябе адказнасці за разгон дэманстрацыі. Сітуацыю, якая склалася ў краіне, можна назваць украінскай рулеткай. Яе адрозненне ад рускай рулеткі заключаецца ў тым, што Украіна націскае на курок да таго часу, пакуль не пачуецца стрэл.

**«Rzeczpospolita» (Польшча)**

Моладзь, якая выходзіць на плошчу, не прымае гэтыя палітычныя гульні і інтрыгі. Для іх ЕС увасабляе сабой сучаснасць, празрыстасць палітычнага жыцця, выратаванне ад задушлівых часоў мінулага і свабоду ад расійскай зоны ўплыву. Яны лічаць сябе часткай глабальнай супольнасці маладых. Многія маладыя ўкраінцы атаясамліваюць сябе з шатландскімі нацыяналістамі, якія імкнуцца пазбавіцца ад улады былой каланіяльнай дзяржавы і вераць, што іх краіна таксама можа стаць незалежнай, сучаснай і квітнеючай еўрапейскай дзяржавай. Яны адукаваныя, ідэалістычна настроеныя, поўныя надзей. Але ці гатовы ЕС мець з імі справы? Я, вядома, жадаю ім поспеху, але баюся, што нашы еўрапейскія палітыкі бліжэй па стылі да Януковіча.

**«The Guardian» (Вялікабрытанія)**

Расія занепакоеная пагрозай другога распаду сваёй дзяржавы, і каб супрацьстаяць гэтаму, яна прыкладае намаганні да таго, каб узяць сітуацыю пад свой кантроль. Украіна ў гэтых адносінах вельмі важная. Адмова Расіі ад Украіны не выглядае магчымай, але чаканне таго, што пераважная большасць украінцаў будзе разам з Расіяй, — гэта таксама ўтопія. Дадзеная сітуацыя вызначыць будучыню Расіі і постсавецкай прасторы або, па меншай меры, істотна паўплывае на яе.

**«Star gazete» (Турцыя)**

У 2004 годзе, падчас «аранжавай рэвалюцыі», Януковіч пасля доўгіх роздумаў зміры́ўся з пратэстамі грамадзян. Цяпер яму зноў давядзецца прымаць рашэнне. Ці будзе ён і далей паважаць правы грамадзян на свабоду слова і сходаў? Як ён адрэагуе на патрабаванні аб сваёй адстаўцы? Адказы на гэтыя пытанні прэзідэнт павінен даць жыхарам Украіны ўжо цяпер. Яму таксама давядзецца адказаць на пытанне, што стане ўрэшце для ўкраінцаў рэальнасцю: еўрапейская мара ці кашмар аўтарытарнай дзяржавы, якая ніколі не зможа стаць часткай Еўропы.

**«Deutsche Welle» (Германія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### МАЛДОВА. КАМУНІСТЫ АСПРЭЧАЦЬ ВЫНІКІ САМІТУ

Малдоўская Кампартыя мае намер аспрэчыць праз суд усе дакументы, якія прадстаўнікі малдоўскага ўраду падпісалі на вільнюскім саміце ЕС. Гаворка перш за ўсё пра парафікаваную ў Літве дамову пра Асацыяцыю Малдовы з Еўрасаюзам. На думку камуністаў, у выпадку судовага працэсу Феміда падтрымае іх, з улікам вынікаў апошніх сацыялагічных апытанняў, паводле якіх урад карыстаецца падтрымкай толькі 13 працэнтаў грамадзян Малдовы. Наступны аргумент — вялікі маштаб пратэстаў, арганізаваных камуністамі супраць ураду. Ім удалося вывесці на вуліцы Кішынёва да 60 тысяч чалавек. «Агульнанацыянальны пратэст пазбавіў дзейныя ўлады рэспублікі легітымнасці і права на падпісанне міжнародных дагавораў», — кажа адзін з лідараў камуністаў. На думку спецыялістаў, судовы іск камуністаў — піяр, арыентаваны на мабілізацыю электарату перад прызначанымі на наступны год выбарамі. Ніводны суд не будзе ўспрымаць такія аргументы ўсур'ёз. Аднак справа камуністаў не такая ўжо і правальная. Яны могуць апеляваць да таго, што Асацыяцыя стане замахам на тэрытарыяльнае адзінства краіны. Як вядома, ЕС патрабуе ад Кішынёва ўстанаўлення мяжы Малдовы з Прыднястроўем, што супярэчыць дзеючай канстытуцыі, якая разглядае Прыднястроўскі рэгіён як частку Малдовы.

**Паводле малдоўскай прэсы**

### КНДР. АРЫШТАВАЛІ АМЕРЫКАНСКАГА ТУРЫСТА




Цяжка сказаць, што падштурхнула жыхара Каліфорніі Мерыла Ньюмана набыць тур у Паўночную Карэю. Так ці інакш, на зваротным шляху яго знялі з самалёта ў аэрапорце Пхеньяна і абвінавацілі ў арганізацыі антыдзяржаўнага «варожага акту». З улікам таго, што турысту 85 гадоў, у такую версію мала хто верыць. Амерыканская прэса лічыць, што Ньюмана адправілі за краты, паколькі ў Паўночнай Карэі ён недзе прагаварыўся, што браў удзел у карэйскай вайне. Амерыканскі ўрад ужо заклікаў Пхеньян вызваліць арыштаванага, у тым ліку з-за яго праблем са здароўем. Сітуацыя вельмі складаная, асабліва таму, што ЗША не маюць дыпламатычнага прадстаўніцтва ў КНДР і мусяць дзейнічаць праз шведскае пасольства, што патрабуе больш часу і бюракратычных фармальнасцяў. Дарэчы, каліфарнійскі пенсіянер — не першы амерыканец, які ўтрымліваецца на турэмных зонах КНДР. Год таму тут арыштавалі 45-гадовага турыстычнага аператара, якога ў выніку асудзілі на 15 гадоў за спробу замаху на кіраўніцтва дзяржавы. У сувязі з апісаным падзеямі Дзяржэдэп ЗША яшчэ раз заклікаў сваіх грамадзян не наведваць КНДР. Між тым, афіцыйнае агенцтва КНДР ужо паведаміла пра тое, што Мерыл Ньюман пакаяўся за тое, што падчас карэйскай вайны забіваў мірных карэйцаў і жаўнераў Паўночнай Карэі. «Я не магу забыць свае злачынствы і на каленях прашу міласці», — гаворыцца ў пакаянным лісце.

**Паводле брытанскай прэсы**

### КАЗАХСТАН. ДЗЕНЬ ЛЮБОВІ ДА ПРЭЗІДЭНТА

28 лістапада ў Астане прайшла незвычайная масавая акцыя — «Дзень любові да прэзідэнта». Яе праводзілі ў рамках Дня першага прэзідэнта. Дзень першага прэзідэнта як дзяржаўнае свята ўзнік у календары ў снежні 2011-га. Дэпутаты парламента, якія ініцыявалі закон, казалі, што «народ Казахстана з асаблівай павагай і прызнаннем ставіцца да заслуг Нурсултана Назарбаева», што Дзень прэзідэнта «падыме патрыятычны дух грамадзян». У Казахстане ўпершыню гэтае свята (дарэчы, у гэты дзень на працу можна не хадзіць) адзначалі 1 снежня 2012 года, аднак не вельмі маштабна. А вось у гэтым годзе ў цэнтр Астаны сагналі каля трох тысяч студэнтаў, якія хорам прызналіся ў любові да Елбасы. Казахі бачылі шмат чаго, аднак такі ўзровень падлізніцтва нават іх, падаецца, шакаваў. Нават некаторыя чыноўнікі крытыкуюць акцыю. Затое казахскі інтэрнэт весяліцца. Тут заклікаюць парламент не спыняцца на дасягнутым і як мага хутчэй прагаласаваць за свята Дзень другога прэзідэнта.

**Паводле казахскай прэсы**

### СІРЫЯ. КУРДЫ АБВЯСЦІЛІ АЎТАНОМІЮ

Курды, якія жывуць на поўначы Сірыі, абвясцілі аб стварэнні тут уласнай аўтаномнай адміністрацыі — пераходнага ўраду, які, сярод іншага, будзе займацца «рашэннем палітычных, ваенных і эканамічных праблем». Ініцыятарамі стварэння аўтаноміі выступіла партыя «Дэмакратычны саюз» і некалькі дробных курдскіх ваенізаваных нацыяналістычных арганізацый. Аўтаномію назвалі «Заходні Курдыстан». Гэта дае падставу меркаваць, што новая аўтаномія будзе намагацца аб'яднацца з іракскай аўтаномнай правінцыяй Усходні Курдыстан. Некаторыя лічаць, што абвяшчэнне аўтаноміі і было замоўлена іракскімі курдамі, які будуць намагацца інкарпараваць гэты край. Між тым, турэцкі ўрад даў зразумець, што не вітае змены на адміністратыўнай мапе Сірыі. Усе разумеюць, што Заходні Курдыстан стане прытулкам для дзеючых у Турцыі арганізацый курдскіх сепаратыстаў.

**Паводле французскай прэсы**

СІСТЭМА

# КАНЕЦ КІТАЙСКАГА ГУЛАГУ?

*Алег НОВІКАЎ*

**Новы прэм'ер Дзяржсавета КНР Лі Кэцян абвясціў, што Кітай гатовы пачаць працэс рэформы турэмнай сістэмы, а менавіта адмовіцца ад Лаогай — спецыяльных лагераў для працоўнага перавыхавання палітычна нелаяльных грамадзян.**



Бацькам стваральнікаў цяперашняй пенітэнцыярнай сістэмы КНР з'яўляецца сам Маа Цзэдун. Прычым арыентаваўся ён на савецкі вопыт. Таму нядзіўна, што турмы Маа разглядаў, як і Сталін, у якасці важнага элемента дзяржавы, у якой будуе сацыялізм. Лагеры часта былі прымацаваныя да якога-небудзь вялікага прадпрыемства: шахты, заводу ці сельскагаспадарчай фермы.

Адна з задач кітайскай турмы — перавыхаванне класавых ворагаў і контррэвалюцыянераў. Галоўным чынам ад антыкамуністычных поглядаў «палітычных» вызвалялі з дапамогай цяжкай фізічнай працы. Абавязковая частка перавыхавання — маршы і скандаванне патрыятычных лозунгаў. Сярэдні тэрмін перавыхавання доўжыўся чатыры гады.

Паводле ацэнак спецыялістаў, праз сістэму перавыхавання за апошнія 50 гадоў прайшлі некалькі дзясяткаў мільёнаў кітайцаў. Яшчэ мільён не здолелі ачысціцца ад варожых думак. Яны загінулі ад цяжкай працы або паканчулі жыццё самагубствам.

Палітычныя зняволеныя ў 1950-х гадах у Кітаі складалі 80 працэнтаў ад іх агульнай колькасці. Праўда, цяпер палітычных зон стала менш. На 2008 год, паводле падлікаў чэшскіх праваабаронцаў, у Кітаі было 320 падобных лагераў. Усяго ў іх знаходзіліся 160 тысяч чалавек. Кітай называе больш сціплую лічбу — 50 тысяч.

Аднак пры гэтым галоўны прававы прынцып не змяніўся. Для таго, каб адправіць у лагер асобу, якая выклікае падазрэнне, не трэба нават фармальнага судовага прысуду. Усё вырашаюць супрацоўнікі Міністэрства грамадскай бяспекі, гэта значыць паліцэйскія чыны.

Захаваўся яшчэ адзін артэфакт часоў Маа — крыміналізацыя дзяржавай цэлых сацыяльных груп. Прыналежнасць да іх адразу гаворыць пра наяўнасць дысідэнцкіх думак. Спачатку ў 1950-я гады ў лагеры ў калектыўным парадку адпраўлялі тых, каго прылічалі да патэнцыйных апанентаў народнай улады. Гэта былі і кулакі, і службоўцы зрынутага рэжыму партыі Гаміндан.

Але ў канцы 1950-х гадоў, калі Маа Цзэдун разгарнуў кампанію супраць «правых», асноўны ўдар наносіўся па інтэлігенцыі. Так працягвалася і далей. Цяпер у турмы кідаюць галоўным чынам па прыналежнасці да секты Фаньгун. Па статыстыцы, кожны другі вязень кітайскага ГУЛАГу — вернік Фаньгун. Часта палітычна ндобранадзейнымі ў КНР лічаць наркаманаў і прастытутак.

Стаць палітвязнем у КНР вельмі проста. Не так даўно Акадэмія грамадскіх навук КНР апублікавала даклад, у якім сістэма працоўных лагераў падвяргаецца крытыцы. Па меркаванні кітайскіх навукоўцаў, яна адкрывае магчымасць для злоўжыванняў з боку праваахоўных органаў і не адпавядае патрабаванням часу.

Гэта наглядна прадэманстравала гучная гісторыя Тан Хуэй з горада Юнчжоў, на поўдні краіны. Адзінаццацігадовую дачку кітаянкі Тан Хуэй згвалтавалі двое паліцэйскіх і прадалі ў сэксуальнае рабства ў правінцыю Хунань. Іх выкрылі. Суд прыгаварыў гэтых дваіх да смерці, яшчэ чацвярых — да пажыццёвага зняволення, аднаго — да 15 гадоў зняволення.

Але Тан Хуэй гэта не задаволіла. Яна патрабавала смяротнага пакарання для ўсіх. І, верагодна, так дасадзіла мясцовым

**Адна з задач кітайскай турмы — перавыхаванне класавых ворагаў і контррэвалюцыянераў. Галоўным чынам ад антыкамуністычных поглядаў «палітычных» вызвалялі з дапамогай цяжкай фізічнай працы**

службоўцам, што яе засадзілі на паўтара гады ў працоўны лагер. Гэты выпадак атрымаў рэзананс і выклікаў шырокае сацыяльнае абурэнне. Жанчыну вызвалілі праз тыдзень. Але яна не супакоілася і працягвала патрабаваць справядлівасці. Урэшце кіраўнік лакальных выпраўленчых устаноў прынёс ёй прабачэнні — праўда, толькі ў вуснай форме. Але жанчыне выплацілі кампенсацыю — 2941 юань (каля 480 долараў).

Кітайскі ГУЛАГ — адна з любімых тэмаў мясцовых дысідэнтаў, што вельмі псуе імідж Пекіну. Улады кажуць, што лагерную тэму нярэдка эксплуатуюць заходнія СМІ для таго, каб абразіць Кітай. Апазіцыянеры, сапраўды, шмат пішуць пра тое, што прымусовая праца ў лагерах выкарыстоўваецца для вытворчасці экспартных тавараў. Кітаязнаўцы не згодныя з гэтым: насамрэч, патрэбы эксплуатаваць працу палітычных няма. Танных працоўных рук для экспартных прадпрыемстваў досыць.

Але ўсе згодныя, што змены ў пенітэнцыярнай сістэме ўсё ж адбудуцца. Зараз навукоўцы і юрысты ў Кітаі, сапраўды, адкрытым тэкстам даказваюць, што нельга саджаць людзей без суда. Той факт, што пытанне наогул абмяркоўваецца, кажа пра намер Кампартыі Кітаю правесці рэформы. Усе галіны турэмнай і судовай сістэмы будуць падпарадкоўвацца агульным патрабаванням.

Але пра пераход да нормаў дэмакратыі на заходні ўзор гаворка не ідзе. «Нездарма кітайскі друк цяпер піша, што трэба ісці сваім шляхам. І прыводзіць у прыклад Расію, дзе спроба запазычаць чужыя парадкі прывяла КПСС да краху», — піша «Независимая газета».

Адзін з кітайскіх дысідэнтаў даў наступную ацэнку цяперашняй сітуацыі ў КНР: «Сёння ўсё робіцца менш жорстка, але ўлады знаходзяць іншыя спосабы, каб пакараць вас, калі вы крытыкуеце кампартыю. Грамадства складаецца з асобных чалавек, але калі чалавек як асоба не ўяўляе ніякай каштоўнасці, то няма і ніякага грамадства. Калі ўладам не спадабаецца тое, што вы сказалі, напісалі ці зрабілі, яны знішчаць усю вашу сям'ю».

Важна адзначыць, што словы кітайскага прэм'ера — гэта трэцяе за апошнія 5 гадоў абяцанне кітайскіх уладаў пакончыць з сістэмай Лаогай. Папярэднія заявы аказаліся пустым гукам. Увогуле, першым ліквідаваць кітайскі ГУЛАГ абяцаў яшчэ Дэн Сяопін. Было гэта аж напрыканцы 1970-х гадоў.

ЭКАЛОГІЯ

# КЛІМАТЫЧНЫЯ АБЯЦАНКІ-ЦАЦАНКІ

Заканчэнне. Пачатак у №45.

Уладзімір ВАЛОДЗІН

**Чарговы кліматычны саміт, што праходзіў з 11 па 22 лістапада ў Варшаве, толькі аддаліў урады ад вырашэння кліматычнага крызісу. Наш журналіст, які пабываў на гэтым саміце, дзеліцца сваімі ўражаннямі.**

## Публіка патрабуе справядлівасці

Хаця і не дапушчаная да паўнавартаснага ўдзелу ў перамовах, разнакаляровая публіка з грамадскіх арганізацый штогод з'язджаецца на кліматычны саміт, каб паспрабаваць дакрычацца да яго ўдзельнікаў і (не ў апошнюю чаргу) пабачыцца паміж сабой. Вакол саміту адбываюцца дзясяткі разнастайных акцый пратэсту. У гэтым годзе яны былі і на вуліцах Варшавы, і перад уваходам на стадыён, і нават у калідорах стадыёну. Чаго патрабуе публіка?

Літаральна перад пачаткам кліматычных перамоваў магутны тайфун скалануў Філіпіны і выклікаў масавую гібель людзей. Здавалася б, стыхійнае бедства, бывае. Але і грамадскія арганізацыі, і філіпінскі ўрад наўпрост звязваюць гэты тайфун са зменамі клімату.

«Гэта не адзіны тайфун ці супертайфун, з якім мы сустрэліся. За апошнія пяць гадоў мы штогод мелі па супертайфуну. Тысячы жыццяў былі загубленыя. Але апошні стаў найбольш магутным і ўдарыў па нас найбольш балюча», — кажа Джэры Аранчэс, нацыянальны каардынатар Філіпінскага руху за кліматычную справядлівасць.

Ён працягвае: «Але тыя, хто выклікаў гэты кліматычны крызіс, усё яшчэ штурхаюць увесь свет да далейшага ўжывання брудных і шкодных крыніц энергіі. Яны спрабуюць прадаць нам «зялёны» вугаль, спрабуюць стварыць болей вуглеродных рынкаў. Спрабуюць накіраваць нас на сцежку памылковых «развязанняў». (...) Мы стаім на ростанях: або кліматычная справядлівасць і сістэмныя змены, або смерць. Мы, філіпінцы, — народ з доўгай гісторыяй барацьбы за справядлівасць, і мы будзем змагацца за кліматычную справядлівасць».

Найбуйнейшая дэманстрацыя (Марш за кліматычную і сацыяльную справядлівасць) адбылася ў суботу, 16 лістапада. Спецыяльна на яе з Брусэля прыехаў адмысловы цягнік з бельгійскімі (і трохі нямецкімі) кліматычнымі актывістамі. У ёй узялі ўдзел больш за 2 тысячы чалавек — няшмат, калі глядзець і па польскіх, і па сусветных маштабах. (Ужо ў наступную суботу, 23 лістапада, вуліцамі Варшавы прайшлі 20 тысяч настаўнікаў, пратэстуючы супраць новага праекта закону аб адукацыі, што можа прывесці да зніжэння настаўніцкіх заробкаў і павелічэння працоўнай нагрузкі).

«Здаецца, што, каб у Польшчы арганізаваць экалагіцкі марш, трэба запрасіць людзей звонку. Мясцовыя, польскія ўдзельнікі былі амаль не заўважныя на фоне іншых дэманстрантаў. Экалагічная свядомасць у Польшчы вельмі нізкая. Людзі вераць дзяржаўнай прапагандзе, нібы занятак боку навакольнага асяроддзя значыць удар па гаспадарцы, паглыбленне крызісу, зніжэнне заробкаў, вышэйшыя рахункі. Яны аддаюць перавагу таму, каб сядзець дома», — падзяліўся са мной уражаннямі ад кліматычнай дэманстрацыі Марцін Вжос.

Дэманстранты прадказальна патрабавалі кліматычнай справядлівасці («Кліматычная справядлівасць зараз!» — іх асноўны лозунг). Ушчыльную да стадыёна ім падысці не далі. Дэманстрацыя прайшла міма і звярнула ў цёмны і напаўзакінуты парк

> «Вугальныя, атамныя і буйныя гідраэлектрастанцыі не даюць доступу да электрычнасці бедным людзям у трэцім свеце», — сказаў Сумя Дута

Скарышэўскі, дзе на невялікай эстрадзе, трыбуны якой былі няздольныя змясціць усіх удзельнікаў, адбыўся мітынг. Паліцыя перакрыла ўсе ўваходы ў парк, так што выпадковыя мінакі не маглі пачуць, чаго там патрабуюць гэтыя «адмарожаныя» экалагісты.

18 лістапада адбылося некалькі акцый супраць вугальнага саміта. Актывісты «Грынпіс» вывесілі вялізны банер на будынку міністэрства эканомікі. Іншыя актывісты «Грынпіс» стаялі з іншым банерам перад уваходам. Побач з міністэрствам некалькі польскіх і міжнародных грамадскіх арганізацый зладзілі тэатралізаваны мітынг «Кашляй за вугаль», на якім з энтузіязмам абкашлялі вугальнае лобі і паабяцалі паставіць яго на калені.

«Вугальныя, атамныя электрастанцыі і буйныя гідраэлектрастанцыі не даюць доступу да электрычнасці бедным людзям у трэцім свеце, — сказаў падчас мітынгу Сумя Дута. — Доступ да электрычнасці для беднякоў у Індыі мала палепшыўся за апошнія 20 гадоў, хаця ўсталяваная магутнасць электрастанцый павялічылася ўтрая. Затое буйныя электрастанцыі прыводзяць да забруджання навакольнага асяроддзя і экалагічных катастроф, выгнання сялян з зямлі, а рыбакоў — з рыбных угоддзяў. Тут на кліматычных перамовах нават урады бедных краін агітуюць за памылковыя, брудныя «развязанні». Але нам патрэбная дэцэнтралізаваная энергетыка з узнаўляльных крыніц, уласнікамі якой будуць мясцовыя супольнасці».

19 лістапада каля ўваходу на стадыён прайшла акцыя супраць атамнага лобі на кліматычных перамовах. Былі і разнастайныя іншыя акцыі, напрыклад, у падтрымку арктычнай трыццаткі.





Аднак сярод няўрадавых арганізацый няма адзінства. Ёсць такія, што ходзяць у гарнітурах і гальштуках назіраць за перамовамі і не губляюць свой час на дэманстрацыі.

І ёсць падставовы падзел паміж няўрадавымі арганізацыямі: за ці супраць вуглеродных рынкаў. За вуглеродныя рынкі выступаюць перадусім рэспектабельныя НДА з заможных краін глабальнай поўначы ці, напрыклад, заходнееўрапейскія партыі «зялёных». Зборам рэспектабельных НДА ёсць альянс CAN — Climate action network (Сетка за кліматычнае дзеянне). Яны ўказваюць на асобныя недахопы рынкаў, просяць іх выправіць, але не ставяць пад сумнеў саму ідэю гандлю паветрам.

Іншая частка грамадскіх актывістаў вядомая пад назвай «Рух за кліматычную справядлівасць». У гэтага руху няма адзінай сеткі. Больш за тое, у апошнія гады не ўсе яго ўдзельнікі бачаць сэнс у тым, каб прыязджаць на «канферэнцыі забруджвальнікаў» (так яны расшыфроўваюць абрэвіятуру COP). Менавіта ў гэтым руху працей знайсці прадстаўнікоў трэцяга свету, розныя нізавыя кліматычныя ініцыятывы і аматараў прамога дзеяння (напрыклад, сядзячых блакад брудных індустрый).

Патрык Бонд тлумачыць розніцу паміж двума кшталтамі экалагістаў: «Можа, існуе нейкая сакрэтная зброя, што прымусіць гандаль вуглеродам працаваць належным чынам, але звонку лідары і стратэгі CAN выглядаюць цалкам беспрынцыповымі што да гандлю вуглеродам. Калі ўрэшце CAN зразумее, што страты ад прапаганды гэтай правальнай фінансава-капіталістычнай стратэгіі пераважваюць карысці?»

Расчараваныя ходам перамоваў у чацвер, 21 лістапада, прадстаўнікі амаль усіх няўрадавых арганізацый (як з CAN, так і з руху за кліматычную справядлівасць) пакінулі стадыён, здаўшы свае акрэдытацыйныя карткі. У той самы дзень прадстаўнікі 132 краін глабальнага Поўдня на знак пратэсту пакінулі перамовы на тры гадзіны з-за незадавальнення абмеркаваннем кампенсацый за страты і пашкоджанні, нанесеныя зменамі клімату.

Пасля дэмаршаў канферэнцыя працягвала працаваць на дзень даўжэй, чым планавалася. Нарэшце ў суботу былі прынятыя нейкія выніковыя дакументы. Але, як і штогод, яны прынеслі толькі расчараванне. Ніхто не збіраецца браць на сябе канкрэтныя абавязкі па зніжэнні выкідаў, а кампенсацыі бедным краінам за выкліканыя зменамі клімату стыхійныя бедствы, што страсаюць іх зараз, адкладзеныя на потым.

Тым часам у некаторых рэгіёнах свету выкіды парніковых газаў змяншаюцца. Але не з-за арганізаваных дзеянняў урадаў ці экалагічнай супольнасці, а дзякуючы эканамічнаму крызісу. Гэта перадусім Еўрасаюз і ЗША, якія заўважна скарацілі свае выкіды пасля 2008 году.

Пакуль ніхто на кліматычных перамовах не збіраецца ўсур'ёз абмяркоўваць эканамічную канцэпцыю «зваротнага росту» (degrowth), якую прапагандуюць многія заходнееўрапейскія зялёныя. Хаця менавіта «зваротны рост» абяцае прывесці да хуткага скарачэння выкідаў.

## Навука раіць не адкладаць

Мы прывыклі разважаць пра «глабальнае пацяпленне». Але з'явы, якія назіраюцца за апошнія дзесяцігоддзі, нашмат больш складаныя і разнастайныя, чым проста ўзняцце тэмпературы. Таму даволі даўно на міжнародным узроўні ўжываецца словаспалучэнне «змены клімату».

Міжнародная група экспертаў па зменах клімату (МГЭЗК) — орган ААН, створаны ў 1988 годзе. Яна займаецца абагульненнем зробленых па ўсім свеце даследаванняў клімату. Апошнія навуковыя назіранні і высновы па гэтай тэме сабраны ў сёлетнім дакладзе «Змены клімату 2013: Прыродазнаўча-навуковы базіс».

Згодна з дакладам, атмасферныя канцэнтрацыі вугляkіслага газу, метану і закісу азоту ($N_2O$) павялічыліся да беспрэцэдэнтных за апошнія 800 000 гадоў узроўняў. У кліматолагаў няма сумневаў, што павелічэнне канцэнтрацый гэтых парніковых газаў — вынік спальвання чалавекам выкапнёвых вуглевадародаў (вугалю, нафты, прыроднага газу).

Хаця неабходнасць зніжаць эмісіі парніковых газаў была прызнаная ўсім светам яшчэ 20 гадоў таму, але з 1990 года выкіды вуглякіслага газу выраслі на 54%.

Глабальная тэмпература павысілася ў сярэднім на 0,85 градуса Цэльсія з 1880 года. Пры гэтым ёсць вобласці (напрыклад, Арктыка), дзе тэмпература павысілася больш як на 1 градус.

Апрача ўласна пацяплення, становяцца больш частымі экстрэмальныя метэаралагічныя з'явы. Так, за апошнія дзесяцігоддзі ў вялікіх частках Еўропы, Азіі і Аўстраліі сталі больш частымі і працяглымі хвалі спёкі. Змяніўся характар дажджоў: у многіх мясцінах павялічыўся аб'ём выпадзення моцных ападкаў, яны сталі значна часцейшымі, а ў некаторых рэгіёнах сталі больш частымі і працяглымі засухі.

«У маёй краіне заўважныя змены клімату, — кажа Нікалас з Зімбабвэ, які прыехаў у Варшаву як прадстаўнік Панафрыканскага альянсу за кліматычную справядлівасць. — Стала меней халодных дзён, а ў цёплы час года тэмпература стала вельмі высокай. За апошнія дзесяць гадоў мы атрымалі шмат праблемаў. Наша сельская гаспадарка залежыць ад дажджоў, а яны змянілі свой характар. Цяпер цяжэй вырасціць ураджай, і гэта адбіваецца на ўсёй эканоміцы. Наш народ цяпер пакутуе ад голаду».

Паўсюдна стаў больш часта назірацца анамальна высокі ўзровень мора. Усё больш хутка таяць ледавікі, у тым ліку лядовае покрыва Антарктыды, Грэнландыі і Паўночнага (ужо не Ледавітага) акіяну. Адтайвае нават «вечная» мерзлата.

У XXI стагоддзі глабальная тэмпература падвысіцца на велічыню ад 1 да 4 градусаў Цэльсія ў залежнасці ад колькасці выкідаў парніковых газаў. Чым большым будзе падвышэнне тэмпературы, тым больш катастрафічнымі будуць змены клімату. У найгоршым выпадку Зямля стане непрыдатнай для існавання чалавека. Але і ў лепшых варыянтах нас чакаюць, напрыклад, пашырэнне арэалаў распаўсюду пераносчыкаў пэўных хваробаў, павелічэнне страт ад паводак і штормаў, масавыя перасяленні людзей з рэгіёнаў, якія стануць непрыдатнымі для жыцця, і масавае выміранне біялагічных відаў.

МАСТАЦТВА

# ЯДВІГА ЛЯСЬЕЎСКАЯ. КВЕТКІ

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ


Партрэт Ядвігі Радзілоўскай (Лясьеўскай)

## Сільветка на ўспамін

З пабітага беларускімі грунтовымі гасцінцамі УАЗіка высыпала купка мужчын, у якіх штось няўлоўнае выдавала асобаў творчых. Няголасна, але ўладарна дырыжавала імі энергічная панна шаноўнага ўзросту, апранутая ва ўрачыста-бялюткую ажурную кофтачку ручной работы з прыгожай брошкай. Руку яе ўпрыгожваў бранзалет з чарнёнага срэбра. Відавочна, яна не любіла бляск золата, і ёй больш імпанавала шляхетнае срэбра, сонцаносны бурштын і гулкая медзь.

Летні ранак, напоены чырвеньскім разнаквеццем палёў, абяцаў спякотны дзень і нямарны надвячорак. Пасажыры УАЗіка не маглі не сфатаграфавацца каля таго дуба з сасной, што растуць, абняўшыся, на дарозе ў Нясвіж ці не з часоў першых Радзівілаў.

Пасажыры — гэта сябры мемарыяльнай камісіі па спадчыне Міхася Сеўрука, утворанай Міністэрствам культуры ў 1979 годзе: падкрэслена шляхетны плакатыст Уладзімір Крукоўскі, падобны на гаспадарніка жывапісец Мікола Назарчук, спартыўны і гожы графік Яўген Кулік, а таксама Аляксей Марачкін. І яна, мастачка Ядвіга Лясьеўская…

Увекапомніла іх пільнае вока і недрыготкая рука Віктара Маркаўца.

## Прыпынак — толькі частка шляху…

Непрадугледжана абавязковы прыпынак ля спавітых дрэваў заўжды абуджаў у яе ўспаміны ранку жыцця… Бесклапотнай дзяўчынкі, узгадаванай у любячай сям'і. У яе імені прысутнічаюць карані нямецкага паходжання. Старажытнагерманскае «Hedwig» паходзіць ад «hadu» — (барацьба, разлад), мо таму яго часта тлумачаць як «ваярка».

З дзяцінства Ядзя была няўрымслівым і хваравітым дзіцём з халерычным тэмпераментам. Усе высілкі бацькоў прывучыць яе да спорту аказаліся марнымі. Наогул, узаемаадносіны з бацькамі былі складанымі, але гэта ніякім чынам не адбівалася на вучобе. Сіла характару, кемлівасць, недзіцячая ўпартасць, прыродная інтуіцыя і здольнасць тонка адчуваць рэчаіснасць — ва ўсім рабілі яе першай.

Няма нічога дзіўнага, што захопленая харастом навакольнага свету думная паненка, якая з гімназічных часоў імкнулася ўвасобіць яго ў фарбах і гуках, наважылася звязаць свой лёс з мастацтвам. Але тут яна мусіла вызначыцца, чаму аддаць перавагу: музыцы ці пэндзлю.

Пытанне вырашылася, калі яна даведалася пра навучальную ўстанову ў Любліне. Народжаная ў першы дзень каляндарнай вясны ў невялічкім забужскім гарадку Бяла-Падляска, па заканчэнні мясцовай гімназіі яна з вялікім імпэтам рушыла ў чароўны свет мастацтва.

## Мадэрн

У Любліне, у Прамыслова-мастацкай школе прайшлі гады яе жыцця з 1929-га па 1931-ы.

Прамыслова-мастацкая школа прывабіла яе не толькі блізкім да дому месцазнаходжаннем, але і выкладчыцкім складам, сэрцам і душой якога быў вучань Яна Матэйкі, мастак-жывапісец, графік і вітражыст, адзін з лідараў «Маладой Польшчы» Юзаф Мехофер (19.03.1869 — 08.08.1946)

Прышчапляючы моладзі парасткі мадэрністычнага мыслення, ён заўжды знаходзіў магчымасць прывесці прыклад з народнага мастацтва Львоўшчыны. Ядвісю ў тыя часы захаплялі павевы нараджанага ў мадэрне накірунку — арт-дэко. З'явіўшыся напачатку стагоддзя (у 1908–1912 гадах), гэтая мадэрновая плынь дасягнула росквіту ў сярэдзіне 1920-х, пасля Міжнароднай парыжскай дэкарацыйна-індустрыяльнай выставы.

Элегантна-прэзентабельная, яна спалучала ў сабе неакласічную пластыку, грацыёзнасць, гуллівасць і манументальнасць, сілкавалася адкрыццямі кубізму і дасягненнямі баўхаўза, а таксама мастацтвам экзатычных краін.

У мясцовых умовах, пры адсутнасці каштоўных і дарагіх матэрыялаў — змяінай скуры, слановай косткі, крышталю ды бронзы, экзатычнай драўніны, — патрэбных для вырабаў, шырокае ўжыванне набывала выкарыстанне геаметрычных арнаментаў, раслінных формаў і цытатаў, запазычанняў з іншых культур.

## Па слядах папярэднікаў

Мінаў час. Зробленага ўсё болела. Творы ірваліся да гледача. У 1938 годзе паненка Ядвіга наважылася ўпершыню прадставіць аматарам мастацтва плён сваёй працы. Наступным крокам мастачкі стаў працяг навучання.

«Скончыла мастацкую школу імя Барыса Месерэра ў Варшаве (1939)», — сведчыць інфармацыя са знаёмай музейнай крыніцы. Але гэта наўрад ці: бо такой школы, як установы, не было.

Заўважым гэта пры ўсёй павазе да славутага тэатральна-мастацкага клану Месерэраў — Азарыя Месерэра (акцёра МХАТа), ягонай сястры Рахіль (маці Маі Плісецкай), сястры Рахілі — балерыны і педагога Суламіф, Барыса Месерэра, які нарадзіўся ў Маскве ў 1933 годзе і потым стаў вядомым тэатральным мастаком.

Але прозвішча Месерэр фігуруе невыпадкова. Прыпускаем, што пры запісе нехта пераблытаў ініцыялы. І мелася на ўвазе школа імя бацькі — Асафа Месерэра (1903 года нараджэння, Вільня) — балетмайстра, народнага артыста і заслужанага дзеяча мастацтваў Літвы, класічнага танцоўшчыкавіртуоза і педагога. Яго гадаванцамі былі Галіна Уланава і Мая Плісецкая, Кацярына Максімава і Вольга Лепяшынская, Алена Чыквайдзе і Шаміль Ягудзін, Барыс Хахлоў і Марыс Ліепа, і шмат хто яшчэ. Яго імя і насіла тэатральная вучэльня пры Варшаўскай акадэміі мастацтваў і «рысавальны клас», што існаваў пры ёй.

## Вяртанне ў Беларусь

Няпросты шлях Ядвігі да Беларусі пачаўся пад акампанемент гулу «месершмітаў» і разрываў бомбаў Другой сусветнай вайны. Бежанцы Ядзі пашэнціла. У Баранавічах яна сустрэла свой лёс. Тут яна пакахала і перарадзілася ў Ядвігу Язэпаўну Раздзялоўскую. Пакахала так аддана і шчыра, што не збаялася застацца пад акупацыяй.

Як маладыя перажылі часы ваеннага ліхалецця — гаворка асобная. Дакладна адно: жывапіс яна не пакідала. Працуючы ў фотаатэлье Бруя рэтушорам, дзе трохі прыхарошвала рэчаіснасць, паспявала выконваць работы (па замовах і без) на продаж і на выставы, што адбываліся ў Баранавічах (1943) і Мінску (1942). Удзельнічала ў «Дажынках», якія праводзіліся ў наваколлі (1942, 1943), апрача таго, брала чын у працы мясцовай мастацкай суполкі «Маладая Беларусь», удзельнічала ў падрыхтоўцы праекта Баранавіцкай мастацкай школы і інш. Па вызваленні ў 1948 годзе яна не без цяжкасцяў (за ўсе свае папярэднія правінасці) стала сябрам Беларускага саюза мастакоў. Уключылася ў выставачную дзейнасць і нават была ўзнагароджана граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Дакументальных звестак пра Ядвігу Язэпаўну вобмаль. Да прыкладу, цяжка сказаць, калі яна пераехала ў Маладзечна; калі Вадзім Андрэевіч атрымаў накіраванне на маладзечанскі малгарзавод, альбо куды і калі, пасля скасавання Баранавіцкай вобласці, з горада з'ехалі іх многія сябры і аднадумцы.

## Лебядзіная адданасць

Не толькі таленавітая мастачка, але і добра адукаваная і выхаваная панна, якая валодала некалькімі замежнымі мовамі і выдатна грала на фартэпіяна, абаяльная жанчына з бездакорным густам, Ядвіга Язэпаўна спрытна наладзіла кантакты з расійскімі мастакамі. Сталася так, што менавіта з Расіі яна атрымоўвала больш запрашэнняў да ўдзелу ў супольных пленэрах, выставах і іншых мерапрыемствах.

Аддана апекуючыся невылечна хворым мужам, яна атрымала ў 1950-я гады ў Саўміне СССР кавалак зямлі пад будоўлю творчай дачы ў Краснадарскім краі. Які прыморскі палац яна пабудавала ў Гарачым Ключы — не ведама, але тое, што Нацыянальны мастацкі музей абавязаны таму дамку яе бліскучымі творамі, народжанымі на беразе цёплага мора, пэўна. (Да «гонару» беларусаў адзначым, што першую творчую майстэрню ў Маладзечне яна атрымала да свайго 80-годдзя). У тым жа 1982 годзе гістарычная радзіма Польшча ўганаравала яе званнем «Заслужаны дзеяч культуры Польшчы».

Але мінае ўсё, мінулі і гэтыя шчаслівыя дзянькі. Яе муж, Вадзім, памёр. Перапрашаем, мусілі б тут паставіць прочырк між датай нараджэння і смерці. Ды Маладзечанскі гарадскі ЗАГС, на запыт, зроблены дырэктарам БДАМЛіМ РБ паведаміў, што «гэта інфармацыя канфідэнцыйнага характару і распаўсюду не падлягае». Во як!

## Улюбёная тэма

За свае больш як 70 гадоў творчага жыцця пані Ядзя паспытала розныя жанры. Напрыклад, у 1961 годзе нейкая светлая галава з Міністэрства культуры даўмелася досыць дасціпна прапанаваць ёй — польцы па нацыянальнасці — супольна з Кастусём Харашэвічам выканаць для краязнаўчага музея жывапіснае палатно на тэму ўз'яднання Заходняй Беларусі: «Маладзечаншчына. 17 верасня 1939 года».

У 1950-я гады, у Гарачым Ключы, дзе зазвычай яны жылі з вясны па восень, працавала над сюжэтнымі кампазіцыямі, не абмінаючы і партрэтны жанр. Але больш за ўсё любіла кветкі. «Любіла маляваць іх у нацюрмортах», — узгадвае цымбаліст і сябра Юрый Церабун. І сапраўды — нацюрморт быў любімым жанрам, які гарманічна нітаваўся з яе ўнутраным ладам.



Карціны Ядвігі Радзілоўскай

# ШЧОДРАГА ТАЛЕНТУ



Справа на лева: самы высокі Аляксей Марачкін, Яўген Кулік, Мікола Назарчук, Уладзімір Крукоўскі і Ядвіга Лясьеўская

Вядомы на беларускіх землях з колішніх часоў, калі прадметны свет проста «памільгваў» у іканапісных абразах, сапраўдную моц нацюрморт набраў у першай палове XIX стагоддзя і выключна сцвердзіўся ў творчасці Івана Хруцкага.

За стагоддзі развіцця ён прайшоў значны шлях. Ад «ілюзіяністычных падманак» да інтэлектуальных падыходаў, спробаў станаўлення памяці, «уцягнення будучыні ў мінулае» — нацюрморт меў дачыненне не толькі да выяваў побытавых рэчаў штодзённага свету, але і да «выявы» быцця ўвогуле.

У 1960-я гады гэты непапулярны ў афіцыёза жанр выходзіць на лідзіруючыя пазіцыі. Нацюрморт — жанр не гендарны, але видучы ў творчасці менавіта жанчын: Валяр'яны Жолтак, Ядвігі Раздзялоўскай, Соф'і Лі, Раісы Кудрэвіч, Аляксандры Паслядовіч, Святланы Катковай, Зоі Ліцьвіной і Зоі Луцэвіч.

Ён стаў для іх прасторай «абсалютнай творчай свабоды, тым светам, дзе яны сталі самі сабой і адкрылі гледачу самыя яркія грані ўласнага таленту». У гэтым суквецці творцаў пані Ядзя займае пачэснае запамінальнае і пазнавальнае месца. Разнастайныя па задуме (заўжды арганічныя — натуральныя), бездакорна скампанаваныя і гарманічныя па колеры, яе нацюрморты сцвярджаюць прыцішаную радасць быцця, яго некрыклівую паэзію і выклікаюць багатыя асацыяцыі.

У яе нацюрмортах не варта вышукваць глыбока схаваныя, таемныя сэнсы, «пакручастыя сюжэтныя — расповеды». Сутнасць яе асобных твораў у бачанні і разуменні існасці матэрыі, яе прыгажосці, багацця фактуры і эфектаў асвятлення.

Маладзечна, Віленская, 5. Па гэтым адрасе ў кватэры на другім паверсе так і жыла, час не марнуючы. Сціпла і трохі адасоблена…

Працавала. З сярэдзіны 1950-х была ініцыятарам стварэння і выкладчыкам у мастацкай студыі для дарослых пры мясцовым ДК. Але прывід адзіноты ўсё нахабней углядаўся ў вокны ейнай кватэры…

## Як заўжды ратавалі сябры…

Да яе «на агеньчык» або з «нагоды» наведваліся мастак Міхась Сеўрук, дырыжор і кампазітар Генадзь Цітовіч, графік Пётар Дурчын, жывапісец з Брэста Іван Рудчык, прыкладнік Фёдар Зільберт, графік Аляксандра Паслядовіч, а крыху пазней, ад 1961 года, кола пашырылася Кастусём Харашэвічам, Аляксанарам Пашкевічам, Галінай Еўдакімчыкавай, Юрыем Церабуном, Васілём Лазоўскім, вучнямі Міколам Аўчыннікавым і Юрасём Герасіменкам.

Апрача прафесійных якасцяў, сябры і калегі шчыра цанілі яе чалавечую далікатнасць і спагадлівасць, востры розум і дабразычлівасць, уменне даць параду неяк неўпрыкмет…

У першы дзень сакавіка на сустрэчу вясны і яе дзень народзінаў, які супадаў з днём нараджэння Шапэна, абавязкова збіраліся ўсе сябры павіншаваць любімую настаўніцу і дарадчыцу, пагаманіць, паслухаць фартэпіянныя творы ў яе выкананні і проста моўчкі «ачысціцца душой».

***

Ядвіга Язэпаўна Раздзялоўская адышла ў іншасвет у 1992 годзе. Але памяць пра яе засталася ў душах вучняў і проста знаёмых. Яны працягваюць сустракацца 1 сакавіка кожнага года. Да 110-х угодкаў сябры-энтузіясты на чале з выкладчыкам музыкі Юрыем Церабуном і акварэлістам Міколам Аўчыннікавым саматугам зрабілі фільм успамінаў пра Ядвігу Язэпаўну. Да юбілею было падрыхтавана слайд-шоў, у якім дэманструюцца 70 яе твораў, аздобленых музыкай любімага ёю Шапэна.

СПАДЧЫНА

# З ІМЕМ СКАРЫНЫ: ВІТАЎТ ТУМАШ

Міхась ЮРЭВІЧ

**Цалкам магчыма, што гэта толькі выпадковы недагляд укладальнікаў кнігі або нават чыясьці злая воля, але, тым не менш, вельмі характэрным для асобы Вітаўта Тумаша падаецца нязгадванне ягонага імя ў кнізе «25-лецьце Беларускае Гімназіі ў Вільні. 1919–1944» (Вільня: Выданьне Беларускае гімназіі ў Вільні, 1944)**

Бо надта ж унікаў ён шырэйшага афішавання сваёй біяграфіі, палітычнай, а часта і грамадскай дзейнасці, калі толькі гэта не было павязана з імем Скарыны.

Вітаўт Тумаш нарадзіўся 20 снежня 1910 года ў вёсцы Спягліца Вілейскага павету Віленскай губерні (сёння вёска Свяцілавічы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці) у сям'і Яна і Петранелы з Канапелькаў. Недзе ў 1915 годзе сям'я падалася ў бежанства, таму першую адукацыю Тумаш атрымаў на летувіскай мове, цікавасць да якой захаваў на ўсё жыццё. Пасля заканчэння пачатковай школы, ад верасня 1924 года да чэрвеня 1930-га, навучаўся ў Віленскай беларускай гімназіі.

У мурах гімназіі ён пазнаёміўся з шэрагам будучых калегаў па грамадскай і навуковай працы ў эміграцыі; у гімназіі ж закладаліся і падмуркі тых адносінаў. З Радаславам Астроўскім не было паразумення, бо Тумаш, блізкі да Максіма Танка, рахаваўся там за чалавека левых поглядаў, а з Янкам Станкевічам, бадай, варагавалі на гістарычнай дзялянцы: «Станкевіч ня гісторык па сваіх студыях, ня стаўся ім, па-мойму, і сяньня, хоць ужо некалькі разоў прабуе пісаць гісторыю «Крывіч-Беларусі». Ягоная «гісторыя» ў вапошняй рэдакцыі, гэта насьпех робленая павярхоўная з некалькі пакладзеных перад сабою кніжак чужых аўтараў, кампіляцыя, без прадуманьня цэласьці й наагул бяз ніякіх сваіх арыгінальных гістарычных гарызонтаў. Іх ён ніколі й ня будзе мець, бо гэта ўжо рыса ягонага характару — ён працавіты, але нейкага навуковага «палёту» чакаць ад яго цяжка. Пішу гэта, бо ведаю яго бліжэй ад 25 гадоў, ад чвэрцьвечча. І ў апошняй ягонай «гісторыі» здараюцца выпадкі, што аўтар дзьве бачыны далей піша зусім адваротнае ці ў разрэз з раней сказаным (што я яму некалі заўважыў і на што ён толькі сказаў "ну, нічога") (Ліст В. Тумаша да А. Вярбіцкага ад 08.12.1952. Захоўваецца ў архіве БІНіМу).

Ад восені 1930 года Тумаш студыяваў на медычным факультэце Віленскага ўніверсітэта імя Стэфана Баторыя. Дыплом аб заканчэнні навукі выпісаны 30 траўня 1939 года.

Ад ліпеня 1939-га да пачатку Другой сусветнай вайны працаваў лекарам у шпіталі ў Беластоцкім Choroszcz, пасля, ад 1940 года, меў прыватную медыцынскую практыку ў Лодзі.

19 кастрычніка 1940 года пабраўся шлюбам з Ксеніяй Грыгарчук, з якой меў троё дзетак.

Дзейнасць Тумаша ў даваенным беларускім нацыянальным руху ўражвае нават адно пералікам пасадаў: адзін з заснавальнікаў Беларускага студэнцкага саюзу, старшыня Таварыства прыяцеляў беларусаведы, віцэ-старшыня Таварыства беларускай школы; ад верасня 1939 года супрацоўнік Беларускага нацыянальнага камітэту ў Варшаве, у 1940–1941 гадах старшыня Беларускага камітэту ў Лодзі.



Вітаўт Тумаш




З пачаткам нямецкай акупацыі Беларусі з ліпеня па лістапад 1941 года Тумаш выконваў абавязкі бургамістра Мінску. Напрыканцы 1941 года выехаў у Германію, дапамагаў з рэдагаваннем газет «Раніца» і «Беларускі работнік», працаваў у берлінскім аддзеле Беларускай народнай самапомачы.

У 1943–1945 гадах быў на пасадзе лекара ў Мекленбургу, ад 1945-га — у Заходняй Германіі, у шпіталі лагеру Люнэбург, ад 1946 года — у лагеры Ватэнштэт, ад 1947-га — у лагерах Гослер, Унтэрлюс, Зеедорф.

Заснаваў «Згуртаванне беларускіх лекараў на чужыне», выдаваў часопіс «Медычная думка» (1946–1950), рабіў захады па перакладзе Бібліі на беларускую мову, запрасіўшы ў адмыслова створаны ім камітэт Леаніда Галяка, Яна Пятроўскага, Уладзіміра Тамашчыка ды іншых.

У ЗША прыехаў 25 лістапада 1950 года. Амерыканскае грамадзянства атрымаў 20 жніўня 1956-га. Жыў у Нью-Ёрку, працаваў у шпіталях (Фордхам, Бронкс, 1952–1976, у аддзяленні хуткай дапамогі, ад 1976 года — у шпіталі Сэйдэнхам на Манхэтане).

Кароткі час ачольваў Урад БНР, браў удзел у выданні газеты «Беларус» — зрабіў два нумары, быў старшынёй Фундацыі імя П. Крэчэўскага (1979–1982).

От жа калі чытаць Тумашава ліставанне, кідаецца ў вочы, што там бадай не закранаецца ніякая іншая дзейнасць акрамя Беларускага інстытуту навукі і мастацтва, фактычным заснавальнікам якога ён стаўся і ўзначальваў ад 1955 года да раптоўнай хваробы ў 1982-м. Тумаш стараўся асабліва не ангажавацца ў палітычную дзейнасць. Шмат сілаў забіралі асабіста-сямейныя справы — гэта здаванне іспытаў на ліцэнзію медыцынскага доктара ды хвароба жонкі, а ўвесь вольны час меўся ісці на адну справу — на БІНіМ.

Зрэшты, навуковая інстытуцыя, створаная Тумашам, таксама не была «адной справаю»: гэта і літаратурна-мастацкі часопіс «Конадні», заснаваны ў 1954 годзе, і «Запісы», выдаваныя ад 1952 года, выставы ў Нью-ёркскай публічнай бібліятэцы, збор беларусікі. Гэта ўласныя доследы — гісторыі кніжнай культуры, а насамперш — спадчыны Францішка Скарыны. З доследаў нямала карысталі скарыназнаўцы ў СССР, не спасылаючыся, натуральна, на першакрыніцу. Ён пісаў пра Скарыну ў Падуі і ў Маскве, даследаваў імя Скарыны, лакалізаваў жыццяпісы першадрукара, вывучаў кнігі Скарыны, аналізаваў скарынаведныя публікацыі.

«Як маглі крыху ўжо заўважыць з друкаванага апошнімі гадамі, доследы над жыцьцём і працай першага ведамага беларускага доктара мэдыцыны Францішка Скарыны сталі маім «нэбэнляйдэншафт». У пошуках за новым і няведамым аб ім перапрасаю бібліятэкі і архівы Эўропы і Амэрыкі. Дзякуючы мадэрнай тэхніцы мікрафільмаў і фотастатаў, седзячы ў Нью-Ёрку, было магчыма раздабыць фотаадбіткі архіўных аб ім дакумэнтаў у Падуі і Кёнігсбэргу, пры тым ёсьць дакумэнты, нікому дагэтуль не вядомыя, новаадкрытыя, з новымі ў іх зьвесткамі аб Скарыне (сёе-тое пра гэта ў чародным нумары «Запісаў»). Ператрос і вялізную аб ім літаратуру — каля 1000 пазыцыяў, якія часта таксама можна было раздабыць толькі з Эўропы пры помачы мікрафільмаў. Маю на мікрафільмах і каля 60% ягоных арыгінальных кнігаў (надрукаваў ён усяго каля 4000 бачынаў). Гэта кнігі, што ляжаць у бібліятэках Эўропы або Ленінграду. Адным словам, у "скарыніяну" ўграз па вушы.

Скарыне, і некаторай іншай навукова-дасьледчай працы, аддаю ўвесь мой вольны час, якога вельмі мала, бо мушу ўвесь час і даволі шмат працаваць на «хлеб штодзённы» для сям'і. Да таго ўвесь час і розныя клопаты ды беды, пра якія хіба нешта Вам раскажа сп. Конюх, калі давядзецца пабачыцца зь ім падчас сёлетніх ягоных аб'ездаў з хорам. Асабліва вострa адчуваецца нястача часу — можна было б рабіць і друкаваць шмат, але калі робіцца гэта толькі ўрыўкамі вольнага ад працы часу, усё ідзе вельмі марудна» (з ліста В. Тумаша да В. Жук-Грышкевіча (?) ад 20.12.1964).

Апошняя праца Вітаўта Тумаша, «Пяць стагоддзяў Скарыніяны» — грунтоўнейшая скарынаведная бібліяграфія — выйшла ў 1989 годзе, калі ўкладальнік ужо быў прыкаваны да ложка. Памёр скарыназнаўца 27 красавіка 1998 года.

ІМПРЭЗА

# «ЛЯПІСЫ» адГРАЛІ НАПОЎНІЦУ

Генадзь КЕСНЕР




**30 лістапада ў Вільні адбыўся доўгачаканы канцэрт-прэзентацыя беларускамоўнага альбома «Грай» культавага рок-гурта «Ляпіс Трубяцкі». У сталіцу Літвы на сустрэчу са сваімі кумірамі прыехалі тысячы беларусаў. Самая буйная канцэртная пляцоўка горада «Sienens-Arena» была забітая «пад завязку».**

Дабіраліся фанаты «Ляпісаў» у Вільню хто як мог. Улады ў асобе транспартнікаў зразумелі, што на апальным калектыве можна «зрубіць бабла», і нават арганізавалі дадатковыя цягнікі і аўтобусы. Пра апошнія асобная гаворка. У касах казалі, што гэта будуць дадатковыя рэйсавыя аўтобусы, але толькі на літоўскай мяжы высветлілася, што гэта не зусім так. Ці зусім не так. Нягледзячы на тое, што дадатковыя аўтобусы каштавалі на адзінаццаць тысяч рублёў больш за звычайныя (160 замест 149), іх пасажыры апынуліся, так бы мовіць, людзьмі другога гатунку на літоўскай мяжы.



Калі беларускія памежнікі ды мытнікі выканалі сваю працу даволі хутка, то іх літоўскія калегі нікуды не спяшаліся. Тры дадатковыя ранішнія аўтобусы былі адсунутыя ў «адстойнік». Літоўскі бок аддаваў перавагу рэйсавым аўтобусам, не звяртаючы ўвагі на дадатковыя, якія чамусьці на мяжы атрымалі статус турыстычных. Пасля таго, як прайшло больш за дзве гадзіны, а ніякага руху не назіралася, многія пасажыры, нягледзячы на жудаснае надвор’е — снег з дажджом і моцны вецер, — вырашылі шыбаваць праз мяжу пешкі. Некаторыя пры гэтым ехалі на канцэрт з дзецьмі, але гэта іх не стрымлівала.



Справа ў тым, што многія з тых, хто загадзя набыў квіткі на канцэрт, маглі атрымаць бясплатную літоўскую візу на тры дні. Натуральна, людзям не хацелася губляць час, бяздарна замярзаючы на мяжы. У выніку ў аўтобусе, у якім ехаў аўтар гэтых радкоў, з амаль сарака пасажыраў, якія селі ў Мінску, да Вільні даехалі толькі адзінаццаць. Астатнія, як і большасць пасажыраў іншых дадатковых аўтобусаў, былі вымушаныя карыстацца паслугамі таксовак альбо прыватнікаў, якія пагаджаліся давезці іх ад мяжы да горада за 90 літаў (амаль 40 долараў). Але можна сказаць, што гэтыя маральныя і дадатковыя матэрыяльныя выдаткі былі кампенсаваныя цудоўным канцэртам.

Дзіўна, але за дзесяць хвілінаў да пачатку імпрэзы арэна была запоўненая толькі менш як напалову. У некаторых прысутных нават з’явіліся крамольныя думкі, а ці не блефавалі арганізатары, калі казалі, што ўсе квіткі даўно распрададзеныя. Альбо большасць патэнцыйных гледачоў ці змыла дажджом са снегам, ці яны вымерзлі на шляху да Вільні. Але як толькі на сцэну выйшаў квартэт «Драм Экстэзі», які выступаў на разагрэве, публіка нібы з неба звалілася. Праз некалькі хвілінаў арэна ўжо была перапоўненая, а вашага карэспандэнта, які раней апынуўся каля сцэны, у выніку ледзь не задавілі, так што пасля некалькіх кампазіцыяў ужо саміх «Ляпісаў» мне давялося літаральна прабівацца на сваё законнае месца адпаведна квітку.

Міхалок і кампанія былі ў гуморы, яны выканалі практычна ўсе свае хіты апошніх гадоў — ад «Капітала» і «Месяца» да «Я веру» і непасрэдна загалоўнай кампазіцыі «Грай» з прэзентаванага альбома. Публіка літаральна стаяла на вушах, нават калі франтмэн «Ляпісаў» — хударлявы, у кароткіх шортах і амаль цалкам пакрыты татуіроўкамі — дэкламаваў вершы ды выказваў свой светапогляд на тое, што сёння адбываецца ў Беларусі ды свеце. Часам словы Сяргея нагадвалі плынь свядомасці, але гэта цалкам мае суб’ектыўнае ўспрыняцце міхалковых эскападаў.

Якасны гук, прафесійны свет, мноства бел-чырвона-белых сцягоў, адпаведны чаканням гледачоў выступ тых, хто знаходзіўся на сцэне, — можна сказаць, што ўсё атрымалася. Калі музыкі сышлі за кулісы, фанаты нават і не падумалі разыходзіцца, гучна патрабуючы ад сваіх куміраў вярнуцца на подыюм. І праз нейкі час «Ляпісы» сапраўды вярнуліся. І выканалі яшчэ некалькі кампазіцыяў. Нездарма казалі, што цяперашні віленскі канцэрт стаўся ледзьве не самым працяглым за ўсю гастрольную дзейнасць гурта. І адным з самых лепшых.

На Дзень Волі, 25 сакавіка 2014 года, у Маскве «Ляпісы» маюць прэзентаваць расійскім гледачам новы альбом «Матрошка». Можна не сумнявацца, што і на гэтым канцэрце беларусаў будзе багата.




- Бізнес-адміністраванне
- Міжнародныя адносіны
- Гуманітарныя навукі
- Журналістыка

www.aauni.edu

Англа-Амерыканскі Універсітэт, Чэшская Рэспубліка, Прага

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК.** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас. 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл. (+375 17) 284 85 11.

**ВЫДАВЕЦ.** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА.**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл. +375 29 986 38 05, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.info

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 1509

Падпісана да друку 06.12.2013. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў. Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая. Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.